

СЕНАТАР ПРА БЯСПЕКУ РЭГІЁНА І СВЕТУ

НАВОШТА БАЦЬКОЎСКІЯ СУБОТЫ



19

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

25 ЛЮТАГА 2022 г.
ПЯТНІЦА
№ 38 (29660)

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ +TV ПРАГРАМА

## КОРАТКА

• **Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 26 лютага прыме ўдзел у «Мінскай лыжні».**

• «Мінсктранс» прыпыняе штодзённыя рэйсы па маршруце Мінск — Кіеў.

• **Больш за 160 прафсаюзных пярвічак створана ў сістэме аховы здароўя за год.**

• Ганаровае званне «Чалавек года Магілёўшчыны» прысвоілі 15 прадстаўнікам рэгіёна.

• **Пяць выставачных праектаў адкрываецца ў Палацы мастацтва.**

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Дзмітрый ЯРАШЭВІЧ, намеснік міністра эканомікі:**

*«Рэальны сектар у поўнай меры скарыстаўся магчымасцямі высокага попыту на сусветных рынках на беларускія тавары і паслугі. Як вынік, у параўнанні з дапандэмійным 2019 годам, у доларавым эквіваленце выручка арганізацый прырасла на 8,4 %, сабекошт — на 7,2 %, прыбытак ад рэалізацыі — на 30,3 %. Мы бачым, што найбольш паспяхова спрацавалі тыя галіны, якія больш правільна ўлічылі ў сваіх вытворчых і маркетынгавых стратэгіях усе нюансы знешняй кан'юнктуры. Сярод лідараў па паказчыках рэнтабельнасці продажаў — прамысловасць, IT-сектар, лясная гаспадарка, фінансавая і страхавая дзейнасць. Галоўным вынікам паспяховай дзейнасці прадпрыемстваў стаў чысты прыбытак больш як Br16 млрд, які дазволіў ім актыўна накіроўваць свае даходы на інвестыцыі і ў цэлым забяспечваць устойлівасць эканомікі».*

ISSN 1990 — 763X

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

# «Трэба шукаць шляхі да недапушчэння кровапраліцця і масавай бойні»

## Прэзідэнт Беларусі правёў нараду з ваеннымі, на якой абмеркаваў абвастрэнне ваеннага канфлікту ва Украіне



Фота БелТА.

**Аляксандр Лукашэнка заявіў, што беларускія ваенныя не прымаюць удзелу ў расійскай спецыяльнай ваеннай аперацыі ва Украіне і пракаментаваў паведамленні некаторых СМІ, што дзяржграніца Украіны на ўчастку Расіі і Беларусі падверглася атацы з боку расійскіх войскаў, якія падтрымліваюцца Беларуссю.**

Абстаноўка па перыметры заходніх і паўднёвых граніц Беларусі рэзка змянілася, сказаў Прэзідэнт ваенным напачатку нарады і падзякаваў, што ўсе яны на працягу ночы працавалі.

«Нам неабходна было падрыхтавацца ў гэтай сітуацыі, як сябе паводзіць, што сказаць нашым людзям. Сёння ночку мы запланавалі нараду, каб на гэтую тэму размаўляць. Вы ведаеце, што сёння Прэзідэнтам Расійскай Федэрацыі прынятае рашэнне аб правядзенні спецыяльнай ваеннай аперацыі ў Данбасе. Прыкладна ў 5.15 у мяне адбылася тэлефонная размова з расійскім Прэзідэнтам. Ён падрабязным чынам праінфармаваў мяне пра сітуацыю і яе развіццё», — паведаміў Аляксандр Лукашэнка.

Ён адзначыў, мэта расійскай аперацыі — спыненне генацыду народаў Данецкай і Луганскай абласцей.

Прэзідэнт дадаў, што на тэрыторыі Беларусі пасля саюзных вучэнняў засталася частка групоўкі расійскіх войскаў. ***«Асабліва падкрэсліваю, каб не было інсінуацый. Падчас апошняй сустрэчы ў Маскве я асабіста прапанаваў Пуціну пакінуць пэўную колькасць Узброеных Сіл Расійскай Федэрацыі на поўдні нашай Беларусі,*** — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. — ***Чаму? Мне не сорамна пра гэта сказаць: мы не былі гатовы прыкрыць паўднёвы напрамак у дадзенай сітуацыі. Паколькі ўкраінскія падраздзяленні рушылі да нашай паўднёвай граніцы і пачалі праводзіць там манеўры «Палессе».***

Па словах кіраўніка краіны, ён прапанаваў пакінуць невялікую частку расійскіх ваенных пакуль не заменіць іх нашымі сіламі. «Пуцін згадзіўся і сказаў: «Ты маеш рацыю, трэба пакінуць. Гэта яшчэ адзін шанц бязглуздым палітыкам з Украіны зрабіць высновы. Магчыма, яны зразумеюць, што неабходна сесці за стол перагавораў і прыняць рашэнне аб міры. Не павінны братэрскія народы ваяваць». Вось аб чым мы дамовіліся. А не рыхтавалі супраць Украіны нейкую вайну», — заявіў Прэзідэнт.

Ён нагадаў, што гэтыя словы былі перададзеныя міністру абароны Украіны падчас яго размоў з беларускім калегам Віктарам Хрэніным. Учора ноччу таксама адбыўся яшчэ адзін адмысловы званок, і ад Прэзідэнта Беларусі міністру абароны Украіны рэкамендавалі звязацца з Генштабам Расіі.

«Пазваніў ён туды? Не пазваніў. Ён, ведаючы, што можа пачацца канфлікт, нават не пазваніў у Маскву», — дадаў Аляксандр Лукашэнка. На яго думку, Украіна быццам бы хацела вайны, бо нічога не рабіла, каб папярэдзіць яе.

Кіраўніцтва нашай краіны прыняла рашэнне аб узмацненні дзяржаўнай граніцы з Украінай. «Замест двух у нарадзе пяць чалавек: кулямётчык, аўтаматчык, гранатамётчык, інструктар з сабакам і старшы нарада. Вечарам тэлефануюць мне: «Аляксандр Рыгоравіч, на граніцы з украінскага боку нікога няма». Разбегліся... Каго там было атакаваць? Да моманту пачатку аперацыі з таго боку не было памежнікаў», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

СТАР. 2

Заканадаўства

# АБЛІЧБАВАНЫЯ СКАРГІ І ПЫТАННІ

## Дазволяць бачыць работу арганізацый са зваротамі грамадзян

**Звароты грамадзян за апошнія пяць гадоў (а з часам, магчыма, і за дзесяцігоддзе) плануюць унесці ў Адзіную рэспубліканскую інфармацыйную сістэму ўліку і апрацоўкі зваротаў грамадзян і юрыдычных асоб, якая распрацавана Міністэрствам сувязі і інфарматызацыі. Апрабацыя гэтага рэсурсу — адна з навацый Закона аб зваротах грамадзян і юрыдычных асоб, які ў Палаце прадстаўнікоў зараз рыхтуюць да другога чытання. Сёння ў інфармацыйнай сістэме зарэгістравана каля трох тысяч арганізацый, у якія, як сведчыць статыстыка, паступае да 90 % зваротаў. А парламентарыі, якія азнаёміліся з яе работай, упэўнены, што айчынны закон аб зваротах — адзіны ў свеце падобнага кшталту, таму так важна, каб ён працаваў дасканала.**

### КАБ ВЕДАЦЬ НАСТРОЙ І ХВАЛЯВАННІ

Дадзены закон — важны дакумент, бо звароты грамадзян дазваляюць наладзіць канструктыўны дыялог паміж уладай і грамадскасцю па вырашэнні найбольш вострых і надзённых пытанняў. З часам у адзінай сістэме будзе знаходзіцца ўся перапіска дзяржорганаў і людзей, усе запыты і адказы, упэўнена **Наталля ТАРАСЕНКА, член Пастаяннай камісіі па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі Палаты прадстаўнікоў:**

— Змены, якія ўносяцца ў закон, вельмі актуальныя і своечасовыя. Яны пасадзейнічаюць таму, што сістэма работы са зваротамі грамадзян стане больш аптымальнай і зручнай як для службовых асоб і арганізацый, так і для людзей, якія да іх звяртаюцца, і зарэкамендуе сябе як добры спосаб стасункаў для вырашэння праблем. Дзякуючы ёй можна будзе прасачыць у тым ліку, каб не парушаліся азначаныя заканадаўча тэрміны адказу людзям.

СТАР. 5

# «Трэба шукаць шляхі да недапушчэння кровапраліцця і масавай бойні»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Ён звярнуўся да ваенных Украіны. «Спыніцеся, з кім вы сабраліся ваяваць? З наймагутнейшай ядзернай дзяржавай. Навошта вам гэта? Але б'юць, страляюць усё роўна. ***Вы думаеце, яны не разумеюць, што не гатовы да вайны з Расіяй? Разумеюць. Дык навошта абвастраюць адносіны? Бо ззаду штыком у пятую кропку штурхаюць на вайну. Вось яны і пайшлі на гэтую вайну і атрымалі адказ***», — канстатаваў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт мяркуе, што Генштабам Расіі задзейнічана ў аперацыі на Данбасе частка войскаў, пакінутая на паўднёвых граніцах Беларусі пасля вучэнняў, але беларускіх ваенных там няма.

«Калі будзе неабходна гэта Беларусі і Расіі, яны там будуць», — заявіў пры гэтым Прэзідэнт.

Але самае галоўнае, адзначыў кіраўнік краіны, што па перыметры нашай граніцы з Польшчай і краінамі Балтыі імкліва нарошчваецца ваенны патэнцыял НАТА.

Аляксандр Лукашэнка нагадаў свае словы, што не дазволіць страляць у спіны рускіх людзей. «Ужо тады я атрымліваў першасную інфармацыю, што з Польшчы і Літвы ствараецца групоўка, каб на пачатку канфлікту з Украінай ім прайсці праз Беларусь ваенным эшалонам, паветраным і наземным шляхам, і ўдарыць у спіну расійскай групоўкі. Тады я іх папярэдзіў: «Мы здраднікамі не будзем і вам не дазволім страляць у спіны рускіх людзей», — заявіў Прэзідэнт.

Ён расказаў, што папрасіў Уладзіміра Пуціна частку сумеснай групоўкі зарэзерваваць у Беларусі на ўсялякі выпадак. «Адказ Пуціна: «Я абяцаю і клянуся, што любое нападзенне ці крок на тэрыторыю Беларусі значыць, што атакуюць Расію», — працытаваў словы расійскага калегі Аляксандр Лукашэнка.

У сітуацыі, што склалася, як акцэнтаваў кіраўнік краіны, неабходна вызначыць меры па забеспячэнні бяспекі дзяржавы і грамадзян.

«***Пры гэтым хачу адзначыць: ніякай надзвычайшчыны. Нічога абсалютна не адбылося. Выведзена для прыкрыцця граніцы на поўдні пяць батальённа-тактычных груп сіл спецыяльных аперацый, узброеных да зубоў. Яны выведзены ўчора вечарам і дзяжураць па ўсім перыметры граніцы. Усе пагранічныя войскі нясуць службу ва ўзмоцненым рэжыме***. Гэтым мы закрылі ўсю граніцу. Зараз нам неабходна падумаць пра найбольш небяспечны напрамак — заходні», — мяркуе Прэзідэнт.

Па яго словах, нічога на паўднёвай граніцы ў найбліжэйшы час не адбудзецца, акрамя магчымых правакацый дыверсантаў.

«Наша задача — вызначыць абарону дзяржаўнай граніцы з краінамі НАТА (Польшча і Літва). Задача была пастаўлена, каб вы бачылі ўсё, не прапусцілі ні аднаго танка, салдата. Мы павінны бачыць усё, што адбываецца ў Польшчы. Ім неабходная вайнушка зараз, каб перакрэсліць непапулярнасць партыі «Права і сумленнасць» і Дуды бязглуздага ў Польшчы. Гэта было б да месца», — упэўнены Аляксандр Лукашэнка.

Ён заклікае беларусаў пазбягаць панікі. «Усе мерапрыемствы, якія запланаваныя, праводзім. Пагрозы ніякай няма для краіны ні на адным напрамку. Але мы планы іх ведаем і бачым», — супакойваў Прэзідэнт.

Задача ваенных — каб кожны беларус адчуваў сябе абароненым, — падкрэсліў ён.

«***Урад і губернатары павінны забяспечыць нармальны рытм эканомікі і аператыўнае рашэнне ўсіх жыццёвых пытанняў грамадзян***», — загадаў Прэзідэнт.

Ён расказаў, што неабходна рабіць зараз, калі канфлікт паміж Расіяй і Украінай ужо пачаўся. Першае — шукаць шляхі да недапушчэння самага горшага.

«***Трэба шукаць шляхі да недапушчэння кровапраліцця і масавай бойні. Пры наземнай аперацыі, калі загіне хоць адзін чалавек, пачнецца вайна поўнамаштабная. Таму гэтага нельга дапусціць***. Я паглядзеў пазіцыю Кітая. Яны мудрыя людзі. Кажуць, што зараз дзверы яшчэ не зачыненыя. Зараз канфлікт яшчэ можна папярэдзіць. ***Каб спыніць эскалацыю, неабходна сесці за стол перагавораў***», — акцэнтаваў кіраўнік краіны.

Ён адзначыў пры гэтым, што расійскае кіраўніцтва ніколі не сядзе за стол перагавораў, не ўзгадніўшы пытанняў для абмеркавання. Аляксандр Лукашэнка дадаў, што Расія ўжо прапісала для НАТА, ЗША, Украіны некалькі прынцыповых пытанняў.

«Там два-тры пытанні для Украіны. Першае — дэмілітарызацыя. Далей — недапушчэнне ўступлення Украіны ў НАТА, спыненне сілавых дзеянняў супраць Данецка і Луганска. Сёння неабходна па ўсіх пытаннях вызначыць парадак і праекты вырашэння. Так, яны будуць больш строгія ў дачыненні да Украіны. Як жа па-іншаму, калі ты церпіш паражэнне? Канечне, пераможца табе нешта прадыктуе, але гэта будзе лепей, чым калі Украіна пацерпіць паражэнне ў вайне», — заявіў Прэзідэнт Беларусі.

Кіраўнік краіны прапанаваў бакам сабрацца ў Мінску і вырашыць канфлікт. «***Мы славяне, тры славянскія народы. Давайце сядзем і вырашым свой лёс на будучыню, назаўсёды***», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Кіраўнік краіны нагадаў тэзіс Уладзіміра Пуціна, які асабліва яму спадабаўся. «Пуцін заявіў, малайчына: «Мы не акупанты. Мы не збіраемся акупаваць Украіну». Што яшчэ неабходна? Гэта аснова для перагавораў. Ён сапраўды не збіраецца акупаваць Украіну. Ніхто не збіраецца насаджаць там свае сілы і ўрад. Гэта аснова перагавораў. На гэтай аснове давайце выпрацоўваць парадак і праекты рашэнняў. Гэта адзіны шанц сёння спыніць эскалацыю, не падысці да кровапралітнай вайны, а магчыма, і спыніць канфлікт, вырашыць усе пытанні», — выказаў Аляксандр Лукашэнка свае прапановы па мірным рэгуляванні.

Прэзідэнт заявіў, што Беларусь не плануе ўцягвацца ў вайну, і аб гэтым ніхто не просіць. «Там без нас здольны разабрацца. Але яшчэ раз падкрэсліваю: калі неабходна, мы акажам дапамогу. Мы саюзнікі, у нас адпаведная дамова, і нас у гэтым не варта папракаць», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Ён заўважыў, што заходнія краіны, Украіна не пакінулі Беларусі альтэрнатыву, прыняўшы санкцыі і спыніўшы эканамічныя праекты ў лагістыцы, энергетыцы.

«Нам неабходна сваю краіну глядзець. Я на ўрачыстым сходзе сказаў: нам ні ў якім разе нельга туды ўцягнуцца з аднаго боку, а з другога — не стаць здраднікамі», — рэзюмаваў тэму Прэзідэнт.

**Марыя ДАДАЛКА.**

# «Гэта першы крок да перамен»

**Пасля нарады Прэзідэнт сустрэўся з беларускімі журналістамі. На ўчарашні дзень у Прэзідэнта планавалася падрабязная размова з айчыннымі СМІ, але з-за парадку дня яна прайшла ў сціслым фармаце. Тым не менш Аляксандр Лукашэнка паабяцаў: вялікую сустрэчу правядуць, але крыху пазней.**



Фота БелТА.

## ПРА ШЛЯХІ ВЫРАШЭННЯ КАНФЛІКТУ ВА УКРАІНЕ

Па словах Прэзідэнта, гэта павінна быць рашэнне трох славянскіх краін. «Я як Прэзідэнт уздзеўваю, што лепей зараз спыніцца, — заявіў Аляксандр Лукашэнка. — Зразумела, мною было сказана: давайце, спыніце ўсякую вайнушку. Асабліва з намі. З намі чаго ваяваць? Мы для ўкраінцаў рабілі ўсё. Нават на шкоду сабе».

Прэзідэнт акцэнтуе, што Украіне неабходна прыняць патрабаванні Расіі, якія ў тым ліку датычацца і нашых інтарэсаў. «Калі Украіна стане ачагом НАТА і будзе накіравана супраць Расіі, то трэніравацца пачнуць на нас. Атрымаецца — тады перанясуць і на Расію. Калі будзе неабходна нейкую ракету запусціць, перадусім на Мінск яе накіруюць, а потым ужо і на Маскву», — заўважыў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт тлумачыць: калі разбураць ці знішчаць Расію, адразу страчана будзе і Беларусь. Таму захаваць Расію — жыццёва важна для нашых інтарэсаў, і эканамічных у тым ліку.

«Трэба разумець, якую палітыку мне даводзіцца ажыццяўляць і па якім лязе нажа сёння крайсці. Тым не менш кіраўніцтва Расіі ніколі не ставіла перада мной пытанне ўдзельнічаць у нейкіх аперацыях, у тым ліку і ўкраінскай», — заявіў ён.

Каб прыкрыць паўднёвы напрамак, на нарадзе абмеркавалі, якую яшчэ зброю мае набыць Беларусь. Па словах Аляксандра Лукашэнкі, пажадана закупіць у Расіі «Іскандэры» і С-400 «Трыумф».

«Гэта такая зброя, ад якой нашы праціўнікі становяцца больш цвярозымі. Мы сёння-заўтра перагаворым з Прэзідэнтам Расіі, каб падмацавацца нам на заходнім напрамку. Украіна Украінай, але шавеляцца ў Польшчы і Літве: разгортваюць брыгады, самалёты, верталёты і іншае», — дадаў Прэзідэнт.

Журналісты пыталіся і пра нарошчванне ваеннай прысутнасці НАТА каля заходніх граніц Беларусі і планаў у адказ нашай краіны. «Важная не тая тысяча, якую амерыканцы да польска-беларускай граніцы перакінулі. Што такое тысяча? Мы з імі разбяромся за дзве-тры гадзіны, справа не ў гэтым. Важна тое, што мы сутыкнёмся з Амерыкай. Калі толькі застрэлім хоць аднаго амерыканскага салдата, сутыкнёмся з імі. І тады пачнецца канфлікт не з тысячай салдат, а з тэхналагічнай у ваенных адносінах машынай, магутнай дзяржавай. У гэтым небяспека», — растлумачыў Аляксандр Лукашэнка.

## ПРЫЗНАННЕ ДНР І ЛНР

Па словах Прэзідэнта, неабходна дакладна разумець вынікі такога кроку Беларусі. Але гэта, тым не менш, не з'яўляецца праблемай для нашай краіны.

«Пытанне стаіць у парадку дня. У найбліжэйшы час мы прымем гэта рашэнне. Зробім так, як лепш і Расіі, і Беларусі», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

## ПРА НАЦЫЯНАЛІЗМ

Як згадаў Прэзідэнт, у 1990-я гады ў нашай краіне бушаваў нацыяналізм. Спыніць яго дапамог толькі рэферэндум. «Калі б не спынілі нацыяналістычны чад, то ў нас прыкладна тое ж і было б (што ва Украіне. — **«Зв.»**), — мяркуе Прэзідэнт. — Таму нам Гасподзь дапамог, і мы спынілі яго ў 90-х. А яны пайшлі тым шляхам».

У кантэксце размовы Аляксандр Лукашэнка нагадаў гісторыю пра заснаванне ЕўрАзЭС. Яшчэ тады ён з Уладзімірам Пуціным абмяркоўваў, што Украіна ніколі не ўвойдзе ў гэта аб'яднанне. «Тады Кучма быў Прэзідэнтам. Быццам бы наш, савецкі. А ў той жа час і сам не дацягнуў. Гэта нацыяналістычнае крыло было настолькі моцным, што ён пабаяўся ісці супраць Рады», — адзначыў кіраўнік краіны.

## РЭФЕРЭНДУМ АДБУДЗЕЦЦА ПРЫ ЛЮБЫХ УМОВАХ

Прэзідэнт Беларусі, адказваючы на адно з пытанняў, адзначыў, што беларусы павінны прыйсці на рэферэндум, інакш гэта стане ганьбай для краіны.

«Мы, наадварот, павінны прыйсці. Гэта не мой рэферэндум і не мая Канстытуцыя. Мне як Прэзідэнту і гэта была б нармальная Канстытуцыя, — сказаў кіраўнік дзяржавы. — Гэта першы крок да перамен. Мы ўсё гэта прапішам і далей пацяху, на працягу года-двух, адбудуем. Гэта будзе зусім іншая, як журналісты кажуць, палітычная мазаіка, палітычная карта Беларусі, зусім іншая, і стрымлівальныя фактары для цяперашняга Прэзідэнта і асабліва — у будучым».

Што да крытыкі праекта абноўленай Канстытуцыі, якую выказваюць апазіцыйныя колы, то было адзначана, што яны не падтрымліваюць любыя рашэнні ўлады. «Для іх усё, што гаворыць Лукашэнка, — гэта ўсё роўна супраць, нават калі ён правільна гаворыць», — заявіў Прэзідэнт.

Таксама ён акцэнтаваў, што, нягледзячы на апошнія падзеі, у яго не ўзнікала думак, каб адмяняць або пераносіць рэферэндум. Пры гэтым, па словах кіраўніка краіны, яўка грамадзян ужо склала каля 15 %.

«Таму ніякай ніколі думкі не было ў мяне і размовы наогул аб тым, каб адмяняць або пераносіць рэферэндум, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. — А навошта? Што змянілася? У краіне ж нічога не змянілася».

## МІНСКАЯ ЛЫЖНЯ

Прэзідэнт плануе 26 лютага прыняць удзел у «Мінскай лыжні», якая пройдзе ў «Раўбічах». «У суботу я хачу паглядзець рэзерв. Правалілі Алімпіяду, вось я хачу паглядзець, каго трэнеры пакажуць, наш найбліжэйшы рэзерв: хто ў Італіі (на наступнай Алімпіядзе. — **«Зв.»**) будзе па гарах поўзаць. Гэта ж ганьба: грошы трацім, а выніку жаданага няма», — сказаў кіраўнік краіны.

**Марыя ДАДАЛКА.**

### Блізкая ўлада

## ВЫКАНКАМЫ НА СУВЯЗІ

**Практыка правядзення прамых ліній рэгіянальнай вертыкаллю працягваецца. Калі ў вас ёсць пытанні або праблемы, якія патрабуюць умяшання органаў улады, тэлефануйце.**

**Тэлефонныя лініі ў суботу, 26 лютага, з 9.00 да 12.00 правядуць:**

- намеснік старшыні Брэсцкага аблвыканкама Вадзім Іванавіч АЛЬШЭЎСКІ. Тэл. 8 016 221 31 21;
- кіраўнік спраў Віцебскага аблвыканкама Аляксандр Уладзіміравіч СЫСОЕЎ. Тэл. 8 021 222 22 22;
- старшыня Гомельскага абласнога Савета дэпутатаў Кацярына Аляксандраўна ЗЯНКЕВІЧ. Тэл. 8 023 233 12 37;
- намеснік старшыні Гродзенскага аблвыканкама Уладзімір Іосіфавіч ДЗЯШКО. Тэл. 8 015 273 56 44;
- намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама Валерый Анатольевіч МАЛАШКА. Тэл. 8 022 250 18 69;
- старшыня Мінскага абласнога Савета дэпутатаў Наталля Віктараўна ЯКУБІЦКАЯ. Тэл. 8 017 500 41 60;
- старшыня Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў Андрэй Аляксандравіч БУГРОЎ. Тэл. 8 017 222 44 44.

# «НАМ ТРЭБА ГЛЯДЗЕЦЬ НА ГІСТОРЫЮ ВАЧЫМА НАШАГА НАРОДА, ПРАЗ ПРЫЗМУ БЕЛАРУСКАЙ ДЗЯРЖАЎНАСЦІ»

**У прэамбуле Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь са зменненнямі і дапаўненнямі, якія выносяцца на рэферэндум, дадаецца такая каштоўнасная ўстаноўка, як самабытнасць. Які сэнс сучасныя гісторыкі ўкладаюць ў гэтае слова? Якія напрацоўкі стаяць за такім канстытуцыйным пасылам? Чаму важна ведаць гісторыю з глыбіні вякоў і чым пагражае страта гістарычнай інфармацыі? З такімі пытаннямі «Звязда» звярнулася да кандыдата гістарычных навук, рэктара Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь Вячаслава ДАНІЛОВІЧА.**



— «Самабытнасць»— вельмі важны тэрмін у Канстытуцыі. Калі мы гаворым аб беларусах як аб нацыі, улічваем адметнасці, што адрозніваюць нас ад іншых народаў, — заўважыў Вячаслаў Віктаравіч. — Беларуская нацыя мае сваю адметную мову, і мы павінны яе захоўваць, аб чым нядаўна гаварыў наш Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка на нарадзе з навуковай супольнасцю. Беларуская мова — душа нашага народа. Гісторыя склалася так, што ў нас дзве дзяржаўныя мовы. І гэта таксама здабытак. Ды не значыць, што мы павінны ўсіх прымушаць гаварыць на беларускай мове, але павінны ствараць умовы, каб кожны грамадзянін яе ведаў. У Канстытуцыі нацыянальная самабытнасць ідзе ў звязцы з такімі словамі, як шматвекавая гісторыя беларускай дзяржаўнасці і суверэнітэт. Гэта вельмі важныя, каштоўныя рэчы. Добра, што яны зафіксаваны ў абноўленым варыянце больш выразна. Важна казаць пра неабходнасць захавання гістарычнай памяці. Сёння вялікая ўвага ўдзяляецца захаванню памяці аб Вялікай Айчыннай вайне. На жаль, падзеі Другой сусветнай вайны найбольш у сучасным свеце падвяргаюцца фальсіфікацыі. У краінах Захаду гэта ўжо выйшла на міжнародны ўзровень, калі прымаюцца заявы адносна Савецкага Саюза, яго ставяць на адну дошку з нацысцкай Германіяй, што для нас абсалютна непрымальна, бо супярэчыць гістарычным фактам. Не менш важна, з пункту гледжання захавання гістарычнай праўды, тое, што Генеральная пракуратура пачала справу аб генацыдзе беларускага народа, абсалютна правамоцна. Мы павінны ўголас казаць аб тым, што рабілася на нашай зямлі нацысцкімі акупантамі, якія імкнуліся знішчыць пераважную большасць насельніцтва, а рэшткі перетварыць у рабоў для новых германскіх гаспадароў.

***— Напэўна, менавіта памяць краіны, дзе спалены тысячы вёсак, была б карыснай для таго, каб паказаць, што нясе з сабой вайна?***

— Безумоўна, Беларусь з'яўляецца фактычна донарам міру. Мы памятаем, што беларусы тысячагоддзямі жывуць на гэтым геапалітычным скрыжаванні і праз нашу тэрыторыю прайшлі тысячы войн і ваенных канфліктаў. Варта задумацца, што, нягледзячы на ўсё гэта, яны адстаялі сваё права жыць на гэтай зямлі. І ў рэшце рэшт мы прыйшлі да суверэннай дзяржавы — Рэспублікі Беларусь. Некаторыя любяць гаварыць, што ў 90-я гады суверэнітэт зваліўся беларусам на галаву ніадкуль. Але трэба ўдумацца: беларусы яго заслужылі, да яго ішлі нашы продкі, яны яго выпакутавалі за тысячагоддзі гэтай у многім крывавай гісторыі. Мы ўжо больш за 30 гадоў не проста існуем як суверэнная Рэспубліка Беларусь, а паспяхова развіваемся, можа, не такімі тэмпамі, як камусьці хацелася. Але тут нельга забывацца, што ў нас фактычна няма прыродных выкапняў у такой колькасці, як у іншых краінах. Наша багацце — у першую чаргу людзі, якія жывуць і працуюць на гэтай зямлі. Наш народ за 30 гадоў даказаў, што ў беларусаў патэнцыял дзяржаўнасці сфарміраваны, мы здольны забяспечыць сваё суверэннае існаванне. Мы павінны захоўваць права народа, які жыве на гэтай тэрыторыі, самастойна вырашаць свой лёс, якім чынам развівацца, з кім у саюзе знаходзіцца, якія інтэграцыйныя аб'яднанні падтрымліваць альбо, наадварот, не прымаць.

***— Мы прывыклі гаварыць, што для вяртання ведаў пра наша мінулае многа было зроблена ў 20-я гады, у час распаду СССР у 80—90-я. Ці трэба больш казаць пра тое, колькі навуковых даследаванняў, адкрыццяў, прац дало XXI стагоддзе?***

— Сапраўды, дзякуючы падтрымцы дзяржавы праведзена велізарная праца. Напрыклад, самыя старажытныя славянскія матэрыялы выяўлены на нашым поўдні, на тэрыторыі Беларускага Палесся, якія датуюцца чацвёртым стагоддзем, — сапраўднае адкрыццё. Мы гэта зафіксавалі ў пяцітомніку «Гісторыя беларускай дзяржаўнасці», інфармацыя ўвойдзе ў абноўленыя падручнікі. Так, беларусы сфарміраваліся як народнасць у XVI стагоддзі, але гэта не значыць, што нашы продкі раптоўна ўзніклі аднекуль. Яны тысячагоддзямі жылі на гэтай тэрыторыі, яшчэ да таго, як пачалі называцца беларусамі. І тыя ж славяне — таксама нашы продкі. Нам трэба глядзець на гісторыю вачыма нашага народа, праз прызму беларускай дзяржаўнасці. У любым гістарычным перыядзе мы павінны прааналізаваць, што было дрэннага, што добрага, што спрыяла фарміраванню і развіццю нашага народа, што перашкаджала. Галоўны пастулат гістарычнай навукі — нельга скажаць і фальсіфікаваць гістарычныя факты і падзеі. Інтэрпрэтацыя іх можа быць рознай, адзін і той жа факт, падзея, гістарычная асоба на адзін народ магла паўплываць станоўча, на другі — адмоўна.

Зроблена шмат у развіцці гістарычнай навукі, наогул гуманітарных ведаў, таму што для гэтага дзяржавай былі створаны ўмовы. Некалькі гадоў таму, калі на сустрэчы з навуковай супольнасцю ў Прэзідэнта запыталіся, якія задачы стаяць перад беларускай гістарычнай навукай, ён сказаў, што задача толькі адна: дайце нам аб'ектыўную карціну гістарычнага мінулага. Патрабаванні аб'ектыўнасці на самым высокім дзяржаўным узроўні — дарагога варта. Гэта дазваляе нармальна выкарыстоўваць гістарычны вопыт без скажэнняў і фальсіфікацый. І ў гэтым моц нашай гістарычнай навукі. На жаль, шмат краін, дзе кіруючыя эліты лічаць, што можна выкрасліць пэўныя перыяды гісторыі як адмоўныя, другія — абяліць, маўляў, быў толькі росквіт. Гэта контрпрадукцыйна, бо пазбаўляе народы гістарычнай памяці.

***— Ці з'яўляюцца такія паняцці, як «самабытнасць» і «гістарычная памяць», асновай эканамічнай (інфармацыйнай, палітычнай) бяспекі?***

— Безумоўна. Пры гэтым ключавой часткай нашай гістарычнай памяці з'яўляецца гісторыя беларускай дзяржаўнасці. Калі я працаваў у Інстытуце гісторыі Акадэміі навук, мы разам з калегамі з ВНУ шмат увагі ўдзялялі даследаванню гісторыі беларускай дзяржаўнасці. Напачатку неабходна было вызначыць, як разумець сам тэрмін «дзяржаўнасць». Прыйшлі да высновы, што дзяржаўнасць — перш за ўсё патэнцыял народа, які фарміруецца тысячагоддзямі праз розныя дзяржаўныя ўтварэнні, якія існавалі на гэтай тэрыторыі. Нашы продкі ўдзельнічалі ў фарміраванні ўладных структур, паступова назапашваўся вопыт, уменні падтрымліваць функцыянаванне дзяржавы на сваёй тэрыторыі. У выніку фарміраваўся ўнутраны патэнцыял, які забяспечвае здольнасць народа да працяглага самастойнага існавання ў выглядзе суверэннай дзяржавы. Мы бачым гістарычныя формы дзяржаўнасці, якія былі на нашай тэрыторыі: Полацкае княства, Тураўскае, Кіеўская Русь, Вялікае Княства Літоўскае, Рускае і Жамойцкае, Расійская імперыя. Гэта поліэтнічныя ўтварэнні, іх гісторыя належыць народам, якія былі ў іх складзе. А ў ХХ стагоддзі мы выходзім на нацыянальныя формы дзяржаўнасці, дзе прысутнічае азначэнне «беларускі». Беларуская Народная Рэспубліка — гэта спроба стварыць дзяржаву, але яна не ўвянчалася поспехам. Першае рэальнае беларускае дзяржаўнае ўтварэнне — Сацыялістычная Савецкая Рэспубліка Беларусь — 1 студзеня 1919 года. Нашы продкі атрымалі сваю дзяржаву, якая развівалася далей у фармаце Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік. А ўжо 30 гадоў мы развіваемся як суверэнная краіна. Гэта найвышэйшая кропка развіцця для любой нацыі. І гэтае дасягненне мы павінны зберагчы.

***— Сучасныя тэхналогіі, сацыяльныя сеткі спрыяюць таму, што фальсіфікацыі множацца? Што з гэтым рабіць?***

— З аднаго боку, інтэрнэт можа спрашчаць жыццё, быць карысным. З іншага — нясе шмат пагроз. І мы павінны як мага шырэй праз сродкі масавай інфармацыі і той жа інтэрнэт даводзіць аб'ектыўную гістарычную пазіцыю. У нас атрымаўся велізарны знакавы цыкл па пашырэнні і прыцягненні ўвагі грамадскасці да гістарычнага мінулага. Ужо было тры гады малой радзімы. Усё пачынаецца з ведання гісторыі сваёй сям'і, роду, мясцін, дзе жывеш, рэгіёна, і ў комплексе гэта выходзіць на гісторыю краіны. 2021-ы быў абвешчаны Годам народнага адзінства, нам патрэбна было згрупавацца, аб'яднацца. Але за гэты год мы выдатна зразумелі, што без ведання гісторыі не можа быць адзінства народа. Калі народ не ведае сваёй гісторыі, у яго няма будучыні. Ён у рэшце рэшт прыйдзе да дэградацыі, растворыцца ў іншых народах. Вельмі лагічна, што 2022-і стаў Годам гістарычнай памяці. Ён насычаны знакавымі юбілеямі, якія дазваляюць зірнуць на нашу гісторыю ад самай старажытнасці да сучаснасці. 1160 гадоў Полацку — калысцы Беларускай дзяржаўнасці. 1030 гадоў Беларускай праваслаўнай царкве, бо ў 992 годзе ў Полацку была ўтворана першая хрысціянская епархія. 505 гадоў выхаду першай друкаванай кнігі на старабеларускай мове. 210 гадоў Айчыннай вайне 1812 года. 100 гадоў з дня стварэння Інстытута беларускай культуры. Далей, у снежні 2022 года, — 100-годдзе Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік. Менавіта ў савецкі перыяд беларуская нацыянальная дзяржаўнасць атрымала неабходны падмурак, на якім стаіць суверэнная Рэспубліка Беларусь. Усё гэта выдатныя даты, якія мы можам належна адзначыць і яшчэ раз задумацца пра тое, што было зроблена ў гэтыя гістарычныя перыяды нашымі продкамі.

***— Якія ўстановы і інстытуты павінны працаваць на гістарычную памяць?***

— Захаваць гістарычную памяць мы можам толькі агульнымі намаганнямі. У першую чаргу такія каштоўнасці перадаюцца праз сям'ю. Вялікую ролю адыгрывае сістэма адукацыі: пачынаючы ад дзіцячых садкоў да вышэйшых навучальных устаноў. Навуковая сфера павінна выпрацаваць наш беларускі погляд на сваю гісторыю. Велізарная праца ў гэтым кірунку зроблена, і вынік яе — «Гісторыя беларускай дзяржаўнасці». Перш чым была выдадзена гэта пяцітомная кніга, 14 гадоў ішлі даследаванні па розных напрамках. Шмат робіцца на дзяржаўным узроўні. Прэзідэнтам зусім нядаўна падпісаны ўказ аб стварэнні Савета гістарычнай палітыкі пры Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Неабходна, каб у практычныя мерапрыемствы па захаванні гістарычнай памяці ўцягвалася моладзь. Недастаткова проста прыйсці з лекцыяй і расказаць пра гісторыю беларускай дзяржаўнасці. Вельмі важна, каб моладзь праз сябе, праз свае пачуцці прапусціла гэтыя веды. Яна можа ўспомніць сваіх продкаў, гісторыю свайго роду. Дарэчы, вельмі цікавы праект некалькі гадоў таму распачаты ў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі — «Народны летапіс Вялікай Айчыннай вайны». Любы ахвотны можа даслаць дакументы, успаміны пра сваіх продкаў, якія ўдзельнічалі ў Вялікай Айчыннай вайне, намаганнямі якіх і была дасягнута Вялікая Перамога над нацысцкімі захопнікамі. Усё фіксуецца, ствараецца электронная база, і выдаюцца адпаведныя кнігі.

***— Якія праекты павінны загучаць у Год гістарычнай памяці?***

— Гэта могуць быць праекты, звязаныя з упарадкаваннем вайсковых пахаванняў і ўвогуле гістарычных аб'ектаў. Акадэмія кіравання праводзіць акцыю «Жыву ў Беларусі і тым ганаруся», дзе мы згадваем тое, што дасягнута нашай краінай. У рамках акцыі «Роднае — народнае» папулярызуем сучасную дзяржаўную сімволіку Рэспублікі Беларусь. Некаторыя кажуць, што сучасная сімволіка не мае глыбокіх гістарычных каранёў, бо прататыпы яе былі прыняты ў БССР у 1951 годзе. Але яе сэнсавае насычэнне, той самы арнамент, які бачым на сцягу, мае тысячагадовую гісторыю. Гэта старажытны сімвал. У нас праходзіць конкурс відэаролікаў «Святло Вялікай Перамогі», для якіх студэнты самі збіраюць інфармацыю пра розныя аспекты, звязаныя з гісторыяй Вялікай Айчыннай вайны. Сёлета будзем распрацоўваць і арганізоўваць пешыя экскурсіі для нашых студэнтаў па гістарычных мясцінах Мінска. Хочам таксама зладзіць турыстычны паход па гістарычных мясцінах асобнага раёна, гэта выдатная магчымасць згадаць пра гістарычныя аб'екты, недзе студэнты могуць і парадак навесці.

Формы, якія раней выкарыстоўваліся для работы з моладдзю, актуальныя і цяпер. Напрыклад, педуніверсітэт ладзіць «зорныя паходы». Гэта добрая практычная работа па захаванні гістарычнай памяці. Калі моладзь уцягваецца ў такія праекты, мы выпрацоўваем у яе імунітэт супраць скажэнняў і фальсіфікацый.

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**

*Поўны тэкст чытайце на сайце zviazda.by*

**ПОЎНЫ ТЭКСТ КАНСТЫТУЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ СА ЗМЯНЕННЯМІ І ДАПАЎНЕННЯМІ, ЯКІЯ ВЫНОСЯЦЦА НА РЭФЕРЭНДУМ, — У НУМАРЫ «ЗВЯЗДЫ» ЗА 22 СТУДЗЕНЯ І НА САЙЦЕ ZVIAZDA.BY**

## Наталля КАЧАНАВА:

# «ЛЮДЗІ АКТЫЎНА ПРЫМАЮЦЬ УДЗЕЛ У ГЭТАЙ ВАЖНАЙ ПАЛІТЫЧНАЙ КАМПАНІІ»

**У Савеце Рэспублікі адбылася сустрэча Старшыні Савета Рэспублікі з кіраўніком місіі назіральнікаў ад Садружнасці Незалежных Дзяржаў, намеснікам Старшыні Выканаўчага камітэта — выканаўчага сакратара СНД Ільхомам НЕМАТАВЫМ.**

Вітаючы госця, спікер верхняй палаты парламента шчыра падзякавала за ўдзел у назіранні за вельмі важным палітычным мерапрыемствам, якое праходзіць у Беларусі, — рэферэндумам па ўнясенні змяненняў і дапаўненняў у Асноўны Закон краіны — Канстытуцыю.

Яна паведаміла, што старт гэтай работы быў дадзены яшчэ ў 2016 годзе, калі Прэзідэнт краіны даручыў пераглядзець Асноўны Закон, бо ёсць нормы, якія неабходна змяніць і жыццё таго патрабуе. Ужо тады была распачата работа над дакументам.

Дарэчы, Савет Рэспублікі ўнёс каля ста прапаноў у праект Канстытуцыі, шэраг з якіх увайшоў у праект, вынесены на галасаванне.

Наталля Качанава падкрэсліла: было арганізавана сур'ёзнае абмеркаванне змяненняў Асноўнага Закона.

— Разгарнулася шырокамаштабнае абмеркаванне тых навел, якія запланаваны ў змененым Асноўным Законе: гэта і дзейнасць грамадскіх прыёмных, і дыялогавых пляцовак, і сустрэчы з працоўнымі калектывамі, — патлумачыла госцю спікер.

Яна звярнула ўвагу, што ў Савеце Рэспублікі таксама дзейнічала грамадская прыёмная, у якую звярталася вельмі шмат людзей. Усяго праз розныя каналы сувязі ад грамадзян паступіла больш за 9 тысяч прапаноў.

— Хачу адзначыць, што было арганізавана сур'ёзнае абмеркаванне, і людзі сапраўды былі зацікаўлены, — акцэнтавала ўвагу Наталля Качанава.

Таксама яна расказала аб самых папулярных прапановах ад людзей:

— Мы вызначылі для сябе топ-3 пытанняў, якія ў большай ступені хвалявалі нашых грамадзян: шлюб паміж мужчынам і жанчынай, два тэрміны для Прэзідэнта, абавязак клапаціцца пра сваё здароўе.

Таксама Старшыня Савета Рэспублікі расказала, што ўжо наведала некалькі выбарчых участкаў, паглядзела ход датэрміновага галасавання.

— З задавальненнем для сябе я адзначыла, што людзі актыўна прымаюць удзел у гэтай важнай палітычнай кампаніі, — падкрэсліла Наталля Качанава.

Яна выказала ўпэўненасць, што назіральнікі ад СНД падыдуць да сваёй місіі аб'ектыўна і непрадузята.

Кіраўнік місіі назіральнікаў ад СНД Ільхом Нематаў у сваю чаргу падзякаваў за цёплыя словы і пракаментаваў работу місіі і доўгатэрміновых назіральнікаў у Беларусі.

— Наша дзейнасць будзе выбудоўвацца на прынцыпах нейтральнасці, аб'ектыўнасці, адкрытасці і галоснасці, з захаваннем беларускіх законаў, — падкрэсліў ён. — Ацэнкі будуць грунтавацца выключна на выніках назірання доўгатэрміновых і кароткатэрміновых назіральнікаў і інфармацыі, якую мы атрымаем з афіцыйных органаў. Ацэнкі будуць аб'ектыўныя: мы ніколі не пішам тое, чаго не бачым.

Таксама ён адзначыў: гэта ўжо 11-я місія СНД, што сведчыць аб вялікім вопыце ўзаемадзеяння бакоў, ЦВК і арганізацый, адказных за правядзенне такіх мерапрыемстваў.

— Нашы юрысты вывучылі змены, якія ўносяцца ў Канстытуцыю. Яны маюць канструктыўны характар, — падкрэсліў кіраўнік місіі назіральнікаў.

Ён расказаў, што ў Беларусі створаны ўсе неабходныя ўмовы для правядзення палітычнай кампаніі з выкананнем законаў нашай краіны, нормаў і прынцыпаў міжнароднага права.

— Нашы доўгатэрміновыя назіральнікі ўжо пабывалі ва ўсіх абласцях і сустрэліся са старшынямі тэрытарыяльных участковых камісій, — паведаміў Ільхом Нематаў. — На іх думку, ЦВК і адпаведныя органы правялі ў Беларусі вельмі вялікую работу па падрыхтоўцы і правядзенні гэтага мерапрыемства на высокім узроўні. Адзначаецца, што на ўсіх участках маецца інфармацыйна-метадычныя матэрыялы, спісы ўдзельнікаў рэферэндуму і тыя змены і дапаўненні, якія ўносяцца ў Канстытуцыю. Любы чалавек можа азнаёміцца з імі і вырашыць для сябе, як галасаваць. Гэта вельмі зручна для ўдзельнікаў рэферэндуму.

Напрыканцы ён адзначыў, што па выніках рэферэндуму будзе створаны каардынацыйны савет, у склад якога ўвойдуць міжпарламенцкія камісіі, прадстаўнікі Парламенцкага сходу Саюза Беларусі і Расіі, Пастаяннага камітэта СНД і супрацоўнікі выканкама.

— З улікам меркавання ўсіх мы створым выніковы дакумент, які плануем агучыць 28 лютага на прэс-канферэнцыі пасля абвяшчэння ЦВК папярэдніх вынікаў галасавання, — рэзюмаваў Ільхом Нематаў.

**Вольга АНУФРЫЕВА.**

## У тэму

**Наталля КАЧАНАВА сустрэлася са студэнтамі Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Беларусі.**

— Акадэмія кіравання пры Прэзідэнце — навучальная ўстанова, дзе выхоўваюцца, навучаюцца будучыя кіраўнікі нашай краіны. Тут людзі з выразнай грамадзянскай пазіцыяй, якія будуць сачыць за падзеямі, што адбываюцца ў Беларусі, на міжнароднай арэне, — цытуе БелТА словы Наталлі Качанавай.

Яна звяртае ўвагу: калі сустрэчы праходзяць у афлайн-фармаце, ёсць магчымасць адкрыта падзяліцца сваімі поглядамі.

— Мы ж у сваю чаргу чуем вас, каб абсалютна дакладна разумець, якія запыты і пытанні ёсць у моладзі. У Савеце Рэспублікі вялікая ўвага ўдзяляецца рабоце з людзьмі. Праводзяцца прыёмы па асабістых пытаннях, прамыя тэлефонныя лініі. Усё гэта дазваляе нам бачыць і чуць праблемы, якія ёсць на месцах. Як вынік — потым рэалізоўваць праекты. Акрамя таго, нам вельмі важна мець зваротную сувязь ад грамадзян, наколькі правільна мы вырашаем тыя ці іншыя пытанні, задачы, вызначаныя ў законапраектах, — кажа яна.

Студэнты актыўна ўключыліся ў дыялог. Гучалі пытанні аб дзяржаўным кіраванні, палажэннях праекта Асноўнага Закона, сацыяльна-эканамічных зменах, якія вызначаць далейшае развіццё краіны пры ўмове прыняцця канстытуцыйных навацый. Удзельнікі сустрэчы абмеркавалі пытанні выхавання моладзі, сусветныя навіны, пагаворылі аб адукацыйных падыходах і дэструктыўным уплыве фэйкаў. У тым ліку маладыя людзі цікавіліся меркаваннем Наталлі Качанавай аб тым, якімі асобаснымі якасцямі павінен валодаць спецыяліст, наколькі важна для беларусаў захаваць гістарычную памяць.

# ПА ПРЫНЦЫПАХ ГАЛОСНАСЦІ І ПРАЗРЫСТАСЦІ

### Паспяховае правядзенне рэферэндуму стане залогам далейшага мірнага развіцця Беларусі

**Аб гэтым падчас сустрэчы са старшынёй Цэнтральнай камісіі па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў, якая адбылася таксама ўчора, заявіў кіраўнік місіі назіральнікаў ад СНД, намеснік старшыні Выканаўчага камітэта — выканаўчага сакратара СНД Ільхом НЕМАТАЎ.**

Па яго словах, у склад місіі ўвайшлі вопытныя дыпламаты, прадстаўнікі Цэнтрвыбаркама, дэпутаты, якія неаднаразова прымалі ўдзел на прэзідэнцкіх і парламенцкіх выбарах краін СНД. «Асноўная задача нашай місіі — аказанне садзейнічання ў правядзенні дадзенай палітычнай кампаніі на высокім арганізацыйным узроўні, з выкананнем законаў Рэспублікі Беларусь, — паведаміў Ільхом Нематаў. — Наша работа будуецца выключна на прынцыпах нейтральнасці, адкрытасці, галоснасці, празрыстасці і, самае галоўнае, неўмяшальніцтва ў падрыхтоўку і правядзенне рэферэндуму, ва ўнутраныя справы з выкананнем прынцыпаў дэмакратыі і свабоды».

## ТЫМ ЧАСАМ

Ужо вядомыя некаторыя вынікі датэрміновага галасавання на рэферэндуме. «За два дні датэрміновага галасавання ў рэферэндуме прынялі ўдзел 14,53 % грамадзян, якія ўключаны ў спісы, — паведаміла **сакратар Цэнтральнай камісіі па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў Алена БАЛДОЎСКАЯ**. — Тройку лідараў складае Гомельская вобласць, дзе колькасць тых, хто прагаласаваў, набліжаецца да 20 %, Магілёўская і Брэсцкая вобласці. Галасаванне праходзіць у рабочым парадку. Нам не паступаюць сігналы аб канфліктных, невырашальных сітуацыях. Асноўнае пытанне, якое непакоіць насельніцтва, — магчымасць прагаласаваць не па месцы рэгістрацыі. Мы ўжо неаднаразова тлумачылі патрабаванні заканадаўства. Паўтаруся: грамадзяне ўключаюцца ў спісы, зыходзячы з іх рэгістрацыі па месцы жыхарства або па месцы знаходжання. Магчымасць уключэння дадаткова ў спісы залежыць ад наяўнасці дакумента, які пацвярджае пражыванне грамадзяніна на тэрыторыі адпаведнага ўчастка для галасавання».

Доўгатэрміновыя назіральнікі, як расказаў кіраўнік місіі ад СНД, працуюць у Беларусі ўжо з 1 лютага. Яны пабывалі ва ўсіх рэгіёнах краіны, абмеркавалі пытанне гатоўнасці да рэферэндуму са старшынямі ўчастковых камісій і адзначылі, што Цэнтральная выбарчая камісія за кароткі перыяд правяла вельмі вялікую работу па падрыхтоўцы да гэтага мерапрыемства. Паводле іх слоў, пакуль сур'ёзных заўваг не выяўлена.

— Падрыхтоўка рэферэндуму ідзе арганізавана, вельмі актыўна, — акцэнтаваў увагу Ільхом Нематаў, які плануе наведаць шэраг участкаў як у Мінску, так і ў рэгіёнах. — Сёння ў Беларусі створаны ўсе ўмовы для правядзення рэферэндуму на высокім арганізацыйным узроўні і з выкананнем законаў Беларусі, створаны ўмовы для свабоднага волевыяўлення насельніцтва краіны. Назіральнікі адзначаюць вялікую цікавасць жыхароў Беларусі да рэферэндуму, да змяненняў і дапаўненняў, якія ўносяцца ў Асноўны Закон. Многія лічаць, што гэта дасць магчымасць распрацаваць новыя законы, накіраваныя на працяг палітычных і эканамічных рэформаў у краіне. Натуральна, гэта будзе садзейнічаць мірнаму і стабільнаму развіццю самой Беларусі.

Як заўважыў **старшыня Цэнтральнай камісіі па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў Ігар КАРПЕНКА**, Цэнтральная камісія і ўся сістэма камісій — ад тэрытарыяльных да ўчастковых — адкрытыя да ўзаемадзеяння з міжнароднымі назіральнікамі. «Сёння іх у краіне 194: у асноўным гэта прадстаўнікі ад СНД, ёсць прадстаўніцтва ад АДКБ, ШАС, — паведаміў кіраўнік Цэнтрвыбаркама. — Разам з тым ужо ёсць 22 назіральнікі, якія прадстаўляюць нацыянальных экспертаў, у тым ліку з краін Еўразаюза. Акрамя таго, працуе звыш 44 тысяч нацыянальных назіральнікаў. Мы пакуль не атрымлівалі ў камісіі сур'ёзных заўваг або пасылаў, якія патрабуюць ад нас прыняцця тэрміновых мер або выпраўлення сітуацыі. Рэферэндум ідзе па тым плане, які мы зацвердзілі на пасяджэнні Цэнтральнай камісіі».

— Мы вельмі доўга працавалі над праектам Канстытуцыі, — адзначыў падчас сустрэчы з місіяй назіральнікаў ад СНД **намеснік старшыні Палаты прадстаўнікоў Валерый МІЦКЕВІЧ**. — Упэўнены, што народ падтрымае змяненні. Канстытуцыя, па якой мы сёння жывём, была прынята адносна нядаўна, аднак гэта быў перыяд зараджэння і станаўлення нашай незалежнай дзяржавы. Гэта Канстытуцыя сваю ролю сыграла. Наша дзяржава адбылася, яна падужэла. Наперадзе — новы этап развіцця. І з гэтым звязана стварэнне новай Канстытуцыі. Мы прапаноўваем многія главы, раздзелы памяняць для таго, каб краіна смела глядзела ў будучыню і развівалася.

**Вераніка КАНЮТА.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## У Атлантыцы згарэлі 4 тысячы Bentley і Lamborghini



На грузавым судне Felicity Ace, якое везла амаль 4000 дарагіх аўтамабіляў з Германіі ў ЗША, дагарэў пажар, які працягваўся некалькі дзён. Кошт згарэлых аўтамабіляў можа дасягаць паўмільярда долараў. Судна выйшла ад берагоў Германіі 9 лютага і накіравалася ў бок ЗША, але ў раёне партугальскіх Азорскіх астравоў на ім пачаўся пажар. На Felicity Ace было загружана амаль 4000 люксавых аўтамабіляў, уключаючы машыны такіх марак, як Porsche, Audi, Bentley і Lamborghini. Пажар пачаўся ў адным з трумаў карабля і стаў хутка распаўсюджвацца на борце, у тым ліку і «дзякуючы» грузу. Справа ў тым, што многія аўтамабілі абсталяваны літый-іоннымі акумулятарамі, якія лёгка запальваюцца. Пакуль невядома, што стала прычынай пажару і ці звязаны ён з аўтамабільнымі акумулятарамі. Каманду з 22 чалавек эвакуіравалі ў той жа дзень, калі пачаўся пажар. А вось судна працягвала гарэць па працягу некалькіх дзён, таму што для тушэння акумулятараў трэба было спецыяльнае абсталяванне, якога ў партугальскіх пажарных не было.

## У Італіі з 1 сакавіка адмяняецца каранцін для ўсіх замежных грамадзян

Міністр аховы здароўя Італіі Раберта Сперанца падпісаў распараджэнне, паводле якога з пачатку сакавіка пры ўездзе ў краіну адмяняецца каранцін для ўсіх замежных грамадзян. Аб гэтым паведаміла ТАСС. «Для ўезду на тэрыторыю Італіі дастаткова сертыфіката аб вакцынацыі, даведкі аб выздараўленні або адмоўнага тэсту на каранавірус», — адзначаецца ў распараджэнні.

## Гіганцкі чорны мядзведзь тэрарызуе жыхароў Каліфорніі

Жыхары мястэчка Саўт-Лэйк-Таха ў Каліфорніі абзавяліся новым суседам, і вельмі непажаданым — гэта гіганцкі чорны мядзведзь, які атрымаў мянушку Хэнк, або, як называюць яго некаторыя, Танк Хэнк, перадала «Бі-бі-сі». За паўгода мясцовая паліцыя атрымала ўжо каля 30 званкоў ад перапалоханых жыхароў, у чые дамы ўрываўся гэты 200-кілаграмовы волат. Бясчынствы Хэнка пачаліся ў лілені мінулага года — у гэты час у мядзведзяў пачынаецца перыяд абжорства, калі яны назапашваюць калорыі перад зімовай спячкай. Аднак з надыходам зімы Хэнк у спячку так і не ўпаў, скардзяцца ў мясцовым дэпартаменце дзікай прыроды. Такое здараецца, калі ў мядзведзяў ёсць доступ да ежы круглы год.

Хэнк якраз-такі прыахвоціўся да чалавечай ежы і, падобна, адмаўляцца ад яе не збіраецца. «Лягчэй адшукаць недаедзеную піцу, чым паляваць у лесе», — тлумачыць яго паводзіны прадстаўнік каліфарнійскага дэпартамента дзікай прыроды Пітэр Тайра.

# АБЛІЧБАВАНЫЯ СКАРГІ І ПЫТАННІ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Айчыннае заканадаўства — адно з самых прагрэсіўных у свеце па рабоце са зваротамі грамадзян, аднак тэхналогіі з часам мяняюцца і, адпаведна, удасканальваецца заканадаўства, заўважыла **намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі Палаты прадстаўнікоў Валянціна РАЖАНЕЦ**:

— Мы імкнёмся закласці ў законе асновы эфектыўных стасункаў улад з грамадзянамі падчас вырашэння пытанняў людзей. Будзе створаны асабісты кабінет, у якім чалавек зможа лёгка і хутка паглядзець сваю перапіску з арганізацыямі і атрыманыя ад іх адказы. Поўную карціну — зварот чалавека і прынятыя па ім рашэнні — будуць бачыць і дзяржорганы. Магчыма, гэта дазволіць пазбавіцца ад недахопаў, якія раней не дазвалялі эфектыўна вырашыць пэўнае пытанне. Сістэма павінна дапамагчы зрабіць нашу агульную работу больш эфектыўнай. Звароты грамадзян — важны сегмент у рабоце дэпутацкага корпуса і дзяржорганаў, бо ён дазваляе даведацца пра настрой людзей і іх хваляванні.



Дэпутаты ўнікаюць, як функцыянуе сістэма.



Наталля ТАРАСЕНКА.

## НАБОР СПРАВАЗДАЧ, ПАРТРЭТ ГРАМАДСТВА І ДАДАТКОВЫЯ СЭРВІСЫ

Пэўна, ні адной краіне не ўдзяляецца столькі ўвагі рабоце са зваротамі грамадзян, як у Беларусі, лічыць **Ганна РАБАВА, намеснік міністра сувязі і інфарматызацыі**. Яна абазначыла праблемы, якія відавочна існуюць у рабоце са зваротамі грамадзян і якія павінна вырашыць новая адзіная сістэма.

Найперш гэта разрозненая рэгістрацыя, бо кожная арганізацыя вядзе сваю базу зваротаў. Таму неабходна было стварыць цэнтралізаваную рэгістрацыю ўсіх зваротаў. Другі момант: спецыялісты паралельна рабілі аналітыку зваротаў па самых розных напрамках, і цяпер існуе шырокі набор справаздач, а таксама канструкцыі, якія дазволяць сфарміраваць справаздачу па існуючых даных націскам адной кнопкі, падзялілася яна:

— Фактычна мы ідзём да таго, каб пераставаць пісаць справаздачы ў вышэйстаячыя органы — яны ўваходзяць у сістэму зваротаў і ўсю карціну бачаць самі. Грамадзянам сістэма зручная тым, што яны ўваходзяць у асабісты кабінет і бачаць усю гісторыю сваіх зваротаў і адказаў, ім не трэба ўспамінаць, калі, каму і што яны пісалі. Пры гэтым грамадзяне, якія прывыклі падаваць заяву на паперы, змогуць працягваць рабіць гэта. Супрацоўнік па рабоце са зваротамі грамадзян пэўнай арганізацыі сам зарэгіструе дакумент у электроннай сістэме.

База адзінай сістэмы стане вельмі важнай, мяркуе **Генадзь ДАВЫДЗЬКА, старшыня Пастаяннай камісіі па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі Палаты прадстаўнікоў**:

— Па зваротах грамадзян бачныя прыхільнасці людзей, па базе можна будзе зрабіць палітычны ці сацыяльны зрэз і стварыць партрэт грамадства, працаваць з грамадскім меркаваннем.

Сістэма зваротаў — самастойная платформа, якая забяспечвае інфармацыйнае ўзаемадзеянне заяўнікаў і дзяржорганаў і прадпрыемстваў, а таксама інфармацыйныя сувязі паміж дзяржорганамі, кантрольныя функцыі і мае шэраг сэрвісных функцый, ахарактарызавала сістэму ўліку і апрацоўкі зваротаў **Алена СВІРЫД, супрацоўніца Інстытута прыкладных праграмных сістэм**:

— Летась сістэма зваротаў была дапрацавана з пункту гледжання дызайну. У платформе закладзены шэраг сэрвісаў і магчымасцяў. Вялікая ўвага ўдзелена стварэнню даведніка-класіфікатара: у нас выкарыстоўваецца 26 даведнікаў і класіфікатараў. Мы можам настройваць асабісты кантэнт сістэмы зваротаў, а ў раздзеле «Дапамога» можна звярнуцца да адміністратара. Існуе таксама сэрвіс «Паведамленне», з дапамогай якога можна даведацца, што прыйшло новае паведамленне, функцыя СМС-апавяшчэння і іншыя карысныя магчымасці.

## ЯК ПАДАЦЬ ЗВАРОТ

Магчымасць самастойнай рэгістрацыі карыстальнікаў пакуль заблакіравана, арганізацыі ў сістэму ўносіць знешні адміністратар. На рэсурсе выкарыстоўваецца дакладная ідэнтыфікацыя карыстальнікаў і прадпрыемстваў, якія прывязаны да УНП. Увайсці ў сістэму грамадзянін можа, выкарыстоўваючы сваю ID-картку. Або прыйсці на пошту і з дапамогай апаратара зарэгістравацца ў нацыянальнай паштовай электроннай сістэме і аўтаматычна стаць і яе карыстальнікам, і сістэмы зваротаў. Тут ёсць дастаткова падрабязная інструкцыя, якая ўтрымлівае копіі экрана і форму рэгістрацыі з палямі і іх апісаннем. Так што ніякіх цяжкасцяў падчас рэгістрацыі ў чалавека не ўзнікне, патлумачыла спецыяліст.

— Для дзяржорганаў, якія працуюць з сістэмай зваротаў, мы распрацавалі шмат відэаматэрыялаў (відэаінструкцый з пакрокавымі дзеяннямі ў рэжыме рэальнага часу з субцітрамі), якія можам прадставіць па запыце арганізацый для азнаямлення з сістэмай. Яна, дарэчы, прадстаўлена на рускай і беларускай мовах.

У сістэме амаль немагчыма стварыць ананімны зварот або сказіць даныя пра сябе. Калі грамадзянін ідэнтыфікуецца праз Адзіную сістэму ідэнтыфікацыі фізічных і юрыдычных асоб ці нацыянальную паштовую электронную сістэму, ён дазваляе сістэме бачыць звесткі пра сябе. Калі ж ён рэгіструецца непасрэдна ў сістэме зваротаў, то выкарыстоўвае выдадзеныя яму сістэмай логін і пароль. Акрамя таго, прадугледжана пацвярджэнне грамадзянінам свайго нумара тэлефона, па якім, калі ён захоча сказіць свае даныя, можна будзе вызначыць рэальныя рэквізіты заяўніка.

Зварот з'явіцца ў сістэме не толькі тады, калі чалавек сфарміруе яго са свайго асабістага кабінета ў сістэме зваротаў ці паштовага адрасавання. Рэгістрацыйную кантрольную картку звароту ў сістэме сфарміруе і ўпаўнаважаны супрацоўнік дзяржоргана ці арганізацыі, куды зварот быў накіраваны іншым спосабам. Напрыклад, пісьмовым паштовым адпраўленнем або ў вуснай форме падчас асабістага прыёму. Усе дакументы, якія чалавек дашле разам са сваім зваротам, таксама будуць захоўвацца ў сістэме. А перапіска заяўніка з арганізацыямі будзе не толькі бачная яму і дзяржорганам, але і мець пэўны статус: завершана яна ці на якой стадыі працэсу разгляду знаходзіцца. Такі падыход робіць прынянцце рашэння празрыстым і ўплывае на яго якасць, сцвярджаюць спецыялісты.

**Ірына СІДАРОК, фота аўтара.**

## Партал рэйтынгу якасці паслуг

Пакуль дэпутаты думаюць над удасканаленнем Закона аб зваротах грамадзян і юрыдычных асоб, пры Міністэрстве сувязі і інфарматызацыі з 2018 года працуе Партал рэйтынгавай ацэнкі якасці аказання паслуг арганізацыямі Рэспублікі Беларусь, на прыкладзе якога відаць, як беларусы ставяцца да работы пэўных устаноў.

— Ён прызначаны для адкрытага дыялогу паміж грамадзянамі і арганізацыямі. Любы чалавек, які прайшоў мінімальную аўтарызацыю (зарэгістраваўся з дапамогай сваёй сацыяльнай сеткі ці электроннай пошты), можа пакінуць тут ацэнку якасці атрыманай паслугі ці адміністрацыйнай працэдуры, па якія ён звяртаўся ў пэўную арганізацыю, — запэўніла **Кацярына НЯЧАЕВА, бізнес-аналітык Інстытута прыкладных праграмных сістэм**.

Для гэтага ў арганізацый, якія знаходзяцца ў сістэме, ёсць асабісты кабінет, дзе пазначаны адміністрацыйныя працэдуры і паслугі. Карыстальніку застаецца адкрыць анкету арганізацыі, выбраць на гэтай старонцы паслугу ці працэдуру, якую ён атрымліваў, і ацаніць яе. Можна таксама паставіць адзнаку і арганізацыі ўвогуле.

Згодна са статыстыкай, самая задавальняльная сфера жыццядзейнасці па сярэднім узроўні задаволенасці грамадзянамі — пагранічны рэжым (88,17 %). Аднак больш за ўсіх ацэнак (85 745) мае адукацыя, якая пры гэтым з'яўляецца найменш задавальняльнай сферай (35,89 %). Менш за ўсіх адзнак на партале ў сферы комплекснага і тэхнічнага абслугоўвання насельніцтва (ЖКГ).

Надвор'е

## У НЯДЗЕЛЮ ІСТОТНА ПАДМАРОЗІЦЬ І СТАНЕ СЛІЗКА

### А ў першыя дні сакавіка тэмпература паветра апусціцца месцамі да мінус 14 градусаў

**Гэтымі днямі актыўныя паўночнаатлантычныя цыклоны (а разам з імі і моцныя вятры) пакінулі нашу краіну. У найбліжэйшыя дні атмасферны ціск будзе расці, а гэта значыць, што нават тыя франтальныя падзелы, якія будуць праходзіць праз тэрыторыю Беларусі ў суботу, вялікай колькасці ападкаў не прынясуць. А ў канцы лютага — пачатку сакавіка пры менш шчыльнай воблачнасці ў начныя гадзіны паветра па краіне будзе астуджацца да 10—14 марозу, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**



Праўда, яшчэ ў пятніцу раніцай і ўдзень у многіх раёнах краіны пройдуць невялікія ападкі ў выглядзе мокрага снегу і дажджу. На асобных участках дарог чакаецца галалёдзіца. Вецер паўднёвы, удзень з пераходам на заходні ўмераны, месцамі парывісты. Тэмпература паветра ўдзень складзе ад мінус 2 градусаў да 8 цяпла.

Больш моцныя начныя замаразкі пачнуцца ўжо ў суботу: уначы па ўсходняй палове краіны, а ўдзень месцамі ў рэгіёнах пройдуць кароткачасовыя ападкі ў выглядзе мокрага снегу і дажджу. У начныя і ранішнія гадзіны ў асобных раёнах чакаецца слабы галалёд, на дарогах галалёдзіца. Вецер заходні, паўночна-заходні ўмераны. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 6 градусаў да плюс 1. Удзень будзе 1—8 цяпла.

Аднак ужо ў нядзелю ападкаў не будзе. Уначы і раніцай на дарогах месцамі прагназуецца галалёдзіца. Вецер паўночны ўмераны. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 2 да мінус 8 градусаў, пры праясненнях па поўначы да 10 марозу. Удзень будзе ад мінус 1 градуса да 6 цяпла.

Згодна з папярэднімі прагнозамі айчынных сіноптыкаў, у панядзелак, у апошні дзень лютага, пераважна без ападкаў, толькі ў асобных раёнах на паўднёвым усходзе краіны магчымы невялікі снег. Уначы і раніцай месцамі на дарогах прагназуецца галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе мінус 1—8 градусаў, пры праясненнях да 11 марозу. Удзень будзе ад мінус 1 градуса да 5 цяпла.

У першы дзень сакавіка чакаецца не зусім вясновае надвор'е. У гэтыя суткі будзе пераважна без ападкаў. Уначы і раніцай на асобных участках дарог галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе 2—9 марозу, пры праясненнях да мінус 10—14 градусаў. Удзень будзе ад мінус 1 градуса да 6 цяпла.

**Сяргей КУРКАЧ.**

Карысныя парады

# ЖЫЦЬ ДОЎГА І НЕ ХВАРЭЦЬ

**У Выдавецкім доме «Звязда» выйшла кніга «Парады доктара Гумена». Як пазбегнуць інсульту, пазбавіцца ад стрэсу і чаму мы хварэем на рак? Якія нашы звычкі шкодзяць здароўю і знішчаюць імунітэт? Як падтрымаць яго без аптэчкі? Як жыць без гаджэтаў і чым небяспечны смартфон? Ад чаго нас выратоўвае лянота і ці варта з ёй змагацца? Як пазбегнуць праблем з пазваночнікам? Як падтрымліваць мікрафлору кішэчніка? Чым небяспечны варыкоз і што будзе, калі гэта захворванне запусціць? Як ачысціць арганізм ад шлакаў? Якія хваробы нясе нам атлусценне і чаму з гадамі мы набіраем лішнія кілаграмы? Гэта некаторыя раздзелы кнігі, адкуль можна даведацца пра важныя факты, што дапамогуць падоўжыць жыццё і пазбегнуць многіх хвароб.**




Напрыклад, ці ведалі вы, што, каб пазбавіцца ад стрэсу, дастаткова... выпіць шклянку вады. А адной з найважнейшых задач у прафілактыцы раку з'яўляецца падтрыманне імуннай сістэмы, якая і змагаецца з ракавымі клеткамі. Як яе падтрымліваць? Найперш весці актыўны лад жыцця, пазбягаць стрэсаў, правільна харчавацца, гуляць на свежым паветры.

Цукар, як вядома, называюць белай смерцю. Хоць ён і з'яўляецца лёгказасваяльным вугляводам, з якога арганізм хутка атрымлівае энергію, але мае адну непрыемную ўласцівасць: шкодзіць нашай імуннай сістэме. Пакуль яна «есць» цукар, то не ў стане займацца знішчэннем вірусаў і іншых інфекцый. А падчас пандэміі COVID-19 аслабляць імунітэт салодкім вельмі непажадана. Акрамя таго, гэта дадатковая нагрузка на нашу падстраўнікавую залозу, бо арганізму трэба нейтралізаваць інсулін, які выпрацоўваецца.

З гадамі мы назапашваем лішнія кілаграмы і апраўдваем гэта замаруджваннем абмену рэчываў. Аднак ва ўзросце з 20 да 60 гадоў ён прыкладна аднолькавы. І гэта азначае, што большую частку жыцця цалкам рэальна заставацца ў адной вазе. Гэта дазволіць пазбегнуць шматлікіх праблем, такіх як высокі артэрыяльны ціск, цукровы дыябет II тыпу і нават некаторыя анкалагічныя хваробы.

Лянота, як ні парадаксальна, — неабходная рэч для нашага арганізма і нервовай сістэмы. Яна задумана прыродай для таго, каб мы працавалі ў больш «энергазахавальным» рэжыме, бо нашы рэсурсы не бясконцыя. Якую ролю адыгрывае лянота ў захаванні здароўя і падаўжэнні працаздольнасці нашага жыцця?

Пра ўсё гэта і многае іншае можна прачытаць на старонках кнігі. «Парады доктара Гумена» — карысныя рэчы на кожны дзень, якія дапамогуць лепш зразумець уласны арганізм і яго патрэбы. І, адпаведна, зрабіць свой лад жыцця больш здаровым і правільным.

Заказаць кнігу можна на сайце oz.by, або набыць у краме «Акадэмкніга».

Доктар Гурбаніджад Гумен Гушанг нарадзіўся ў Тэгеране (Іран). Скончыў Гродзенскі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт (1999) і застаўся працаваць ў Беларусі. Па спецыяльнасці ён нейрахірург. Працаваў у РНПЦ неўралогіі і нейрахірургіі, а цяпер — навуковы супрацоўнік анкалагічнага (нейрахірургічнага) аддзялення РНПЦ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя М. М. Аляксандрава. Выкладае на кафедры неўралогіі і нейрахірургіі Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі. Намеснік старшыні Дома дружбы іранцаў у Беларусі.

Прыярытэты

# Абследаваць нованароджаных за некалькі секунд

## У РНПЦ дзіцячай хірургіі адкрыўся кабінет камп'ютарнай тамаграфіі

**Новы дыягнастычны апарат дазволіць хутка праводзіць самыя складаныя абследаванні і замяніць іншыя — больш траўматычныя. Гэта першы, сабраны спецыяльна для дзяцей рознага ўзросту, у тым ліку і нованароджаных, 2-энергетычны рэнтгенаўскі КТ-апарат (кожная з трубак апарата разлічана на 128 зрэзаў). Ва ўрачыстым адкрыцці кабінета прынялі ўдзел віцэ-прэм'ер Ігар ПЕТРЫШЭНКА, міністр аховы здароўя Дзмітрый ПІНЕВІЧ, дырэктар РНПЦ дзіцячай хірургіі Канстанцін ДРАЗДОЎСКІ.**



Ігар Петрышэнка адзначыў, што такі камп'ютарны тамограф — гэта вялікае дасягненне.

— Толькі за мінулы год мы пераасначасцілі 27 аб'ектаў, сярод якіх МНПЦ хірургіі, транспланталогіі і гематалогіі, бальніцы і паліклінікі ў рэгіёнах. Дзе б ні пражываў чалавек, яму павінны забяспечыць якасную дапамогу — у любым пункце краіны. А дзецям — першачарговая ўвага, — сказаў ён.

Як расказаў Канстанцін Драздоўскі, гэты апарат у цэнтры чакалі каля пяці гадоў — з моманту адкрыцця. Ён быў жыццёва неабходны для дыягностыкі маленькіх дзяцей з вагой 1,5—2 кілаграмы. Раздзяляльная здольнасць пачынаецца ад адной дзясятай міліметра, што дазволіць атрымаць максімальна выразную інфармацыю. Апарат мае дзве трубкі, якія за адзін абарот даюць інфармацыі ўдвая больш. А таксама меншую прамянёвую нагрузку, чым аналагі. Гэта важна, бо даследаванне трэба выконваць не адзін раз. Гэта асноўныя перавагі апарата.

Дырэктар цэнтра адзначыў, што самая складаная праграма (яна прымяняецца для даследавання сэрца) зойме ўсяго 20—30 секунд. А агульныя праграмы могуць працягвацца да секунды. Адна з асноўных задач гэтага КТ — замяніць іншыя, больш траўматычныя для дзяцей даследаванні.

— Адна з асноўных задач апарата — замяніць траўматычнае даследаванне — ангіякардыяграфію. Такіх даследаванняў за год мы выконваем 600—700: каля 400 дазволіць зрабіць гэты апарат, — прывёў лічбы Канстанцін Драздоўскі.

Апарат — першы ў краіне, спецыяльна сабраны для маленькіх дзяцей. У асноўным на ім будуць дыягнаставаць прыроджаныя парокі сэрца, такія даследаванні будуць выконвацца пад наркозам.

**«Гэты апарат у цэнтры чакалі каля пяці гадоў — з моманту адкрыцця. Ён быў жыццёва неабходны для дыягностыкі маленькіх дзяцей з вагой 1,5—2 кілаграмы».**

Ігар Петрышэнка расказаў аб асноўных выдатках на медыцыну і высокатэхналагічнае абсталяванне ў апошні год. Толькі ў 2021 годзе на сістэму аховы здароўя дзяржава выдзеліла 8,8 мільярда рублёў, а гэта 5 % ВУП. Аб'ёмы павялічыліся на 30 %, у тым ліку два мільярды вылучаны на барацьбу з ковідам.

— За 2021 год мы патрацілі 730 мільёнаў рублёў, каб у нашых установах аховы здароўя з'явілася сучаснае абсталяванне па апошнім слове тэхнікі. Забеспячэнне аховы здароўя ўсім неабходным — ключавы прыярытэт нашай дзяржавы, — падкрэсліў намеснік прэм'ер-міністра.

**Алена КРАВЕЦ.**


**ИЗВЕЩЕНИЕ**
**акционеров открытого акционерного общества**
**«Минсктелекомстрой»**
**о проведении очередного общего (годового) собрания акционеров**

Дата проведения собрания акционеров – **28 марта 2022 года**.
Время начала проведения собрания акционеров – **12.00.**
Место проведения собрания акционеров – **Минский р-н, п. Ратомка, ул. Заславская, 8а, актовый зал**.
Дата составления списка лиц, имеющих право на участие в собрании акционеров, – **03 марта 2022 года.**
Форма проведения собрания акционеров – **очная.**

**ПОВЕСТКА ДНЯ СОБРАНИЯ:**

| | |
|---|---|
| **Вопрос 1.** | Об утверждении годового отчета Общества за 2021 год. |
| **Вопрос 2.** | Об утверждении отчета наблюдательного совета Общества за 2021 год. |
| **Вопрос 3.** | Об утверждении отчета ревизионной комиссии за 2021 год и рассмотрении заключения ревизионной комиссии о финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2021 год. |
| **Вопрос 4.** | О рассмотрении аудиторского заключения по бухгалтерской отчетности Общества за 2021 год. |
| **Вопрос 5.** | Об утверждении годовой бухгалтерской отчетности Общества за 2021 год. |
| **Вопрос 6.** | О распределении чистой прибыли, остающейся в распоряжении Общества за 2021 год. |
| **Вопрос 7.** | О выплате дивидендов в 2022 году. |
| **Вопрос 8.** | Об избрании членов наблюдательного совета Общества. |
| **Вопрос 9.** | Об избрании членов ревизионной комиссии Общества. |
| **Вопрос 10.** | О вознаграждении членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии Общества. |

**Порядок регистрации лиц, имеющих право на участие в собрании акционеров**:

- время регистрации участников собрания акционеров – **с 10.00 до 11.40** в день проведения собрания акционеров;
- руководитель акционера – юридического лица должен предъявить группе регистрации документ, удостоверяющий личность, а также документ, подтверждающий полномочия руководителя – копию контракта, который должен быть передан группе регистрации;
- акционер – физическое лицо должен предъявить документ, удостоверяющий личность;
- представитель акционера (юридического или физического лица) должен предъявить документ, удостоверяющий личность, и оригинал доверенности, которая должна быть передана группе регистрации.

**Порядок ознакомления с информацией (с документами) лицами, имеющими право на участие в собрании акционеров:**

Информация (документы), подготовленные к собранию акционеров, могут быть предоставлены акционеру Общества (его представителю) в виде копий документов для ознакомления.

При ознакомлении с информацией (документами), подготовленными к собранию акционеров не допускается их фото- и (или) видеофиксация, выдача их нарочно.

- руководитель акционера – юридического лица должен предъявить документ, удостоверяющий личность, а также документ, подтверждающий полномочия руководителя – копию контракта, который должен быть передан лицу, определенному генеральным директором Общества для выполнения этих функций;
- акционер – физическое лицо должен предъявить документ, удостоверяющий личность;
- представитель акционера (юридического или физического лица) должен предъявить документ, удостоверяющий личность, и оригинал доверенности, который должен быть передан лицу, определенному генеральным директором Общества для выполнения этих функций.

С информацией (документами), подготовленной к собранию акционеров, можно ознакомится в рабочие дни (понедельник – пятница) **с 09 по 25 марта 2022 года в период времени с 14.00 по 15.00 по адресу – г. Минск, ул. Аннаева, 49/1-1, кабинет юрисконсульта, либо в день проведения собрания 28 марта 2022 года – по месту его проведения**.

УНП 100068131



ИЗВЕЩЕНИЕ

**29 марта 2022 года**

**СОСТОИТСЯ ГОДОВОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ**

**ОАО «Камволь»**

Собрание акционеров пройдет по месту расположения Общества:
**г. Минск, ул. Маяковского, 176,**
**конференц-зал, 4-й этаж главного корпуса**

**Повестка дня**

1) Отчет о финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2021 год и основных направлениях деятельности Общества на 2022 год.
2) Отчет наблюдательного совета за 2021 год.
3) Отчет ревизионной комиссии за 2021 год. Заключение по результатам проведения ежегодной ревизии.
4) Аудиторское заключение, подготовленное по результатам проведения аудита годовой бухгалтерской (финансовой) отчетности.
5) Утверждение годовых отчетов Общества за 2021 финансовый год.
6) Распределение прибыли и убытков по итогам работы Общества за 2021 год.
7) Порядок распределения чистой прибыли на 2022 год и 1-й квартал 2023 года.
8) Избрание членов наблюдательного совета Общества.
9) Избрание членов ревизионной комиссии Общества.
10) Утверждение условий материального вознаграждения членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии.
11) Утверждение Устава ОАО «Камволь».
12) Утверждение Положения о наблюдательном совете ОАО «Камволь».
13) Утверждение Положения об аффилированных лицах ОАО «Камволь».

С материалами, подготовленными к собранию, можно ознакомиться по адресу: **г. Минск, ул. Маяковского, 176, каб. 211, тел. 354-16-22.**

Начало работы собрания – 10.00.

Регистрация участников собрания с 09.30. до 10.00.

Список акционеров ОАО «Камволь» для участия в собрании акционеров будет составлен по состоянию на 15.03.2022.

УНП 100074393

Мясцовае Самакіраванне
25 лютага 2022 г. № 7 (643)
Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ







Фота БелТА.

# ВЕДАЙ СВАЮ КАНСТЫТУЦЫЮ

## Сенатар ініцыяваў конкурс эсэ з такой назвай

**СПІКЕР верхняй палаты парламента Наталля КАЧАНАВА сустрэлася з пераможцамі адмысловага творчага конкурсу для старшакласнікаў.**

У ім бралі ўдзел навучэнцы 9—11 класаў школ Камянецкага раёна Брэсцкай вобласці і Маскоўскага раёна абласнога цэнтра. З ініцыятывай правядзення выступіў член Савета Рэспублікі галоўны ўрач Брэсцкай абласной клінічнай бальніцы Аляксандр Карпіцкі. У прыватнасці, на конкурс было прадстаўлена 41 эсэ ад 23 устаноў адукацыі Брэстчыны. Пераможцамі сталі 13 работ у такіх намінацыях, як «Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь і яе месца ў маім жыцці», «Канстытуцыя — аснова непахіснасці правоў чалавека», «Правы і свабоды — найвышэйшая каштоўнасць», «Закон галоўны, Закон важны — Канстытуцыя краіны», і іншых.

Вітаючы пераможцаў у Савеце Рэспублікі, яго спікер асабліва падкрэсліла:

— Наша дзяржава прававая, мы жывём па законах, таму вельмі важна, каб Асноўны Закон нашай краіны быў накіраваны на захаванне пераемнасці пакаленняў, тых асноўных традыцый, якія былі і ёсць у нашай краіне, захаванне яе суверэнітэту і незалежнасці і дакладнае вызначэнне ўзаемаадносін асобы і дзяржавы, асобы і грамадства.

Гаворачы аб галоўным дакуменце краіны, спікер верхняй палаты парламента падкрэсліла:

— Мы ўсе павінны разумець, што ў Канстытуцыі адлюстраваць усё немагчыма. Канстытуцыя — Асноўны Закон. Дзеля яе развіцця, калі на тое воля народа, будзе распрацоўвацца велізарная колькасць законапраектаў. Там — галоўныя пастулаты, там не можа быць іх шмат.

Старшыня Савета Рэспублікі нагадала словы кіраўніка дзяржавы аб прынцыпах, закладзеных у Асноўны Закон:

— Гэта павінен быць закон кампактны, выразны, зразумелы кожнаму ў нашай краіне: няхай гэта будзе палітык ці просты рабочы, ці настаўнік, ці той, хто сёння далёкі ад палітыкі, але ён павінен разумець: вось тое, што дзяржава мне гарантуе, вось мае абавязкі ў адпаведнасці з Канстытуцыяй, а вось тое, што непарушна, — суверэнітэт, незалежнасць і сацыяльная арыентацыя нашай дзяржавы. Гэта тое, аб чым неаднаразова казаў Прэзідэнт.

Наталля Качанава выказала ўдзячнасць школьнікам за іх грамадзянскую пазіцыю і разуменне працэсаў у грамадстве:

— Вы — выпускнікі, але ўсё роўна дастаткова маладыя, каб быць моцна паглыбленымі ў палітыку. Але разам з тым вы выказалі свае прапановы і бачанне, і гэта вельмі для нас важна, — адзначыла Старшыня Савета Рэспублікі.

стар. 8

АКЦЭНТЫ

**Наталля КАЧАНАВА:**

## «Калі кіраўнік на сваім месцы — там няма пытанняў ні з зарплатай, ні з сацпакетам»

**СПІКЕР верхняй палаты парламента сустрэлася з прадстаўнікамі перспектыўнага кадравага рэзерву Брэсцкага аблвыканкама і моладдзю Брэстчыны.**

### Сумленнасць і патрыятызм — галоўныя якасці

На сустрэчу са Старшынёй Савета Рэспублікі прыехалі 75 маладых чалавек, якія задзейнічаны ў розных сферах: ад дзяржаўнага кіравання да аховы здароўя. Галоўнае, што іх аб'ядноўвала, — жаданне пазнаёміцца са структурай верхняй палаты парламента і з першых вуснаў пачуць адказы на свае пытанні. А іх было дастаткова шмат і на розныя тэмы. Па традыцыі, гутарка насіла адкрыты фармат: маладыя людзі маглі задаваць абсалютна розныя пытанні, якія датычацца не толькі прафесійнага жыцця спікера. І, трэба сказаць, яны скарысталіся такой магчымасцю.

На пачатку сустрэчы маладым хлопцам і дзяўчатам правялі экскурсію па будынку Савета Рэспублікі, у музеі іх пазнаёмілі з гісторыяй верхняй палаты, якая з'яўляецца палатай тэрытарыяльнага прадстаўніцтва і за гісторыю суверэннай Беларусі абіраецца ўжо сёмы раз. Таксама моладзь больш дэталёва даведалася аб структуры Савета Рэспублікі, дзейнасці сенатараў у рэгіёнах, заканатворчай і экспертнай рабоце членаў Савета Рэспублікі.

Вітаючы гасцей у зале пасяджэнняў, Наталля Качанава падкрэсліла, што з задавальненнем прымае такія прапановы аб правядзенні сустрэч, бо гэта не толькі натхняе іх удзельнікаў, але дазваляе атрымаць жывыя чалавечыя стасункі, якіх часам усім не хапае.

Даючы ацэнку якасцям любога кіраўніка (а на сустрэчы, адзначым, былі ў пераважнай большасці тыя маладыя людзі, якія хутка будуць разглядацца ў якасці кандыдатаў на ўзначальванне калектываў і работу на кіраўнічых пасадах), Старшыня Савета Рэспублікі падкрэсліла: кандыдат павінен быць сумленным, справядлівым і адданым сваёй краіне і яе народу. Яна выказала ўпэўненасць, што вызначальнымі з'яўляюцца асабістыя якасці кіраўніка, гэта ў большай ступені і ўплывае на вынікі яго работы.

— Калі чалавек на сваім месцы — там няма пытанняў ні з заработнай платай калектыву, ні з сацыяльным пакетам, — падкрэсліла яна.

### Актыўная, эфектыўная і аператыўная

Што датычыцца работы над законапраектамі, Наталля Качанава патлумачыла механізм узаемадзеяння палат парламента пры выпрацоўцы аператыўных рашэнняў. У якасці прыкладу яна прывяла падзеі 2020-га, калі прымаліся змены ў Крымінальны, Крымінальна-працэсуальны і Крымінальна-выканаўчы кодэксы, распрацоўваліся новыя законапраекты «Аб абароне персанальных даных», «Аб недапушчальнасці рэабілітацыі нацызму».

Наталля Качанава асабліва падкрэсліла, што памяць ад Вялікай Айчыннай вайне не падлягае забыццю, таму гэты пастулат было вырашана прапісаць у тым ліку на ўзроўні Асноўнага Закона краіны, змяненні і дапаўненні ў які зараз вынесены на ўсенародны рэферэндум.

— Жыццё настолькі дынамічнае, і падзеі, якія адбываюцца ў свеце, так хутка змяняюцца, што мы выдатна разумеем: работа над законапраектамі павінна быць такая ж актыўная, эфектыўная і накіраваная на перспектыву — на будучыню, — патлумачыла спікер верхняй палаты парламента і акцэнтавала ўвагу ўдзельнікаў сустрэчы на тым, што работа сенатараў над законапраектамі распачынаецца на пачатковым этапе распрацоўкі разам з калегамі з Палаты прадстаўнікоў. Гэта дае магчымасць аператыўна прымаць рашэнні, якія наспелі ў грамадстве.

стар. 8






# ВЕДАЙ СВАЮ КАНСТЫТУЦЫЮ

*(Заканчэнне. Пачатак на 7-й стар.)*

Таксама яна падзякавала педагогам за тое, што яны прывіваюць маладым людзям пачуццё патрыятызму, любові да роднага краю, падштурхоўваюць іх думаць і аналізаваць падзеі ў краіне і ў свеце.

Адзначым, што па традыцыі сустрэча прайшла ў фармаце адкрытага дыялогу — без купюр і закрытых тэм для абмеркавання.

Напачатку Наталля Качанава расказала аб дзейнасці палаты тэрытарыяльнага прадстаўніцтва — Савета Рэспублікі, функцыях яго членаў, рабоце над законапраектамі і функцыянаванні экспертнага савета пры Савеце Рэспублікі, а пасля адказала на пытанні гасцей. Маладых людзей цікавілі нюансы правядзення цэнтралізаванага тэсціравання з улікам змяненняў і дапаўненняў у Асноўны Закон, арганізацыі вучэбнага працэсу ў школах і гімназіях, фарміравання профільных класаў і складзе школьнай праграмы.

Многія з узнятых пытанняў спікер верхняй палаты, як кажуць, узяла на аловак і паабяцала ў найбліжэйшы час вывучыць іх змест больш дэталёва разам з профільным міністэрствам.

> Мы ўсе павінны разумець, што ў Канстытуцыі адлюстраваць усё немагчыма. Канстытуцыя — Асноўны Закон. Дзеля яе развіцця, калі на тое воля народа, будзе распрацоўвацца велізарная колькасць законапраектаў. Там — галоўныя пастулаты, там не можа быць іх шмат.

У гутарцы з журналістамі Наталля Качанава звярнула ўвагу: конкурс быў прысвечаны дастаткова няпростай для старшакласнікаў тэме — «Ведай сваю Канстытуцыю», але маладыя людзі справіліся выдатна.

Даючы ацэнку сустрэчы, спікер звярнула ўвагу на яе пазітыўнасць і добры настрой.

— Але самае галоўнае — у маладых людзей было дастаткова шмат пытанняў, якія, сапраўды, спатрэбяцца ў нашай рабоце, — кажа яна і тлумачыць: у гэтым і заключаецца зваротная сувязь паміж парламентарыямі і маладымі людзьмі, якія заканчваюць школу, абіраюць будучую прафесію і плануюць сваё далейшае жыццё.

> Гэта павінен быць закон кампактны, выразны, зразумелы кожнаму ў нашай краіне: няхай гэта будзе палітык ці просты рабочы, ці настаўнік, ці той, хто сёння далёкі ад палітыкі, але ён павінен разумець: вось тое, што дзяржава мне гарантуе, вось мае абавязкі ў адпаведнасці з Канстытуцыяй, а вось тое, што непарушна, — суверэнітэт, незалежнасць і сацыяльная арыентацыя нашай дзяржавы. Гэта тое, аб чым неаднаразова казаў Прэзідэнт.

Акрамя таго, яна запэўніла, што ўзнятыя сёння пытанні ідуць ад жыцця, абсалютна правільныя і патрабуюць урэгулявання.

Што датычыцца вынікаў творчага конкурсу, усе пераможцы былі ўзнагароджаны дыпломамі і атрымалі сертыфікаты ўдзельнікаў конкурсу. А пасля сустрэчы са спікерам Савета Рэспублікі гасцям правялі экскурсію па будынку верхняй палаты парламента і пазнаёмілі з музеем.

**Вольга АНУФРЫЕВА.**

# «Калі кіраўнік на сваім месцы — там няма пытанняў ні з зарплатай, ні з сацпакетам»

*(Заканчэнне. Пачатак на 7-й стар.)*

Патлумачыла яна і неабходнасць падтрымкі дзяржавай маладзёжнай палітыкі на ўзроўні Асноўнага Закона.

— За маладымі — будучыня. Мы такімі ж былі, але такімі ж, як вы, не будзем, а вы, як мы, будзеце, — адзначыла спікер.

Паводле яе меркавання, усё найлепшае, што сёння ёсць у старэйшага пакалення (вопыт, веды), неабходна перадаваць маладым, каб краіна развівалася надалей.

— Мы ўсе хочам, каб краіна была такой жа вольнай, незалежнай, каб на зямлі панавалі мір і спакой, — упэўнена Наталля Качанава. — Мы ўсё сваё свядомае жыццё гэта робім. Не без памылак. Але яны ёсць, калі ёсць стрыжань, аснова, тыя скрэпы, якія аб'ядноўваюць людзей. Яны ўсё перажывуць і ў сям'і, і ў краіне.

## Быць самаадданым справе і ахвяраваць часам

У гутарцы з журналістамі Наталля Качанава расказала, што нездарма праводзяцца такія сустрэчы:

— Яны пачулі ад нас, чым мы займаемся, даведаліся аб той няпростай рабоце, што чакае любога кіраўніка, які цалкам аддаецца сваёй справе.

Паводле яе ацэнкі, быць кіраўніком любога ўзроўню вельмі няпроста, бо гэта заўсёды звязана з самааддачай і ахвяраваннем уласным часам, якога і так не заўсёды хапае.

— І калі ты размаўляеш з гэтымі маладымі людзьмі, адчуваеш іх імкненне займацца такой работай, — падкрэсліла Наталля Качанава. — Мне заўсёды цікава адказаць на іх пытанні, бо для іх наш вопыт (людзей, якія прайшлі адпаведны жыццёвы шлях у прафесійным і асабістым станаўленні) вельмі важны.

Пасля сустрэчы са спікерам верхняй палаты парламента маладыя людзі накіраваліся на экскурсію ў Палац Незалежнасці.

**Вольга АНУФРЫЕВА.**

ТЛУМАЧЫМ НЮАНСЫ

# АБАВЯЗАК КОЖНАГА, ХТО ЛЮБІЦЬ СВАЮ КРАІНУ

**СТАРШЫНЯ Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Таццяна РУНЕЦ 23 лютага прыняла ўдзел у датэрміновым галасаванні на рэспубліканскім рэферэндуме па пытанні ўнясення змяненняў і дапаўненняў у Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь.**



— Удзел у рэспубліканскім рэферэндуме па пытанні змяненняў і дапаўненняў у Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь — абавязак кожнага грамадзяніна нашай краіны, — пераканана сенатар. — І перш за ўсё гэта адказнасць перад папярэднімі пакаленнямі беларусаў, якія вызвалялі яе ад нацысцкіх захопнікаў, самааддана працавалі на аднаўленні нашай цудоўнай Радзімы, герaічная памяць пра што замацавана ў праекце абноўленага Асноўнага Закона.

Старшыня профільнай камісіі звяртае ўвагу, што гэта абавязак і перад цяперашнім маладым пакаленнем беларусаў — дзецьмі і ўнукамі, — якім трэба будзе жыць, вучыцца, працаваць на карысць і росквіт сваёй краіны, будаваць яе будучыню.

— Менавіта таму мне як члену Канстытуцыйнай камісіі прыемна адзначыць, што ў праекце Асноўнага Закона знайшоў сваё адлюстраванне абавязак дзяржавы ва ўсебаковай падтрымцы і духоўным, маральным, інтэлектуальным і фізічным развіцці моладзі, стварэнні неабходных умоў для яе свабоднага і эфектыўнага ўдзелу ў грамадскім жыцці, рэалізацыі патэнцыялу ў інтарэсах грамадства, — падкрэсліла Таццяна Рунец.

Сенатар таксама адзначыла, што, галасуючы за абноўлены праект Асноўнага Закона, мы галасуем і за дабрабыт будучых пакаленняў беларусаў, якім абавязаныя пакінуць у спадчыну прыгожую, квітнеючую і творчую краіну.

У сталічнай гімназіі парламентарый, акрамя ўдзелу ў датэрміновым галасаванні, азнаёмілася з арганізацыяй работы трох участкаў для галасавання, якія размешчаны ў будынку ўстановы адукацыі. Старшыні, члены ўчастковых камісій і назіральнікі праінфармавалі сенатара аб ходзе датэрміновага галасавання.

***

**У Дзень абаронцаў Айчыны, 23 лютага, на ўчастак для галасавання таксама завітаў старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве Сяргей СІВЕЦ. Тут ён прыняў удзел у датэрміновым галасаванні на рэспубліканскім рэферэндуме па пытанні ўнясення змяненняў і дапаўненняў у Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь.**

— Сёння асабіста для мяне вельмі знамянальны дзень, — кажа сенатар. — Маё жыццё непарыўна звязана з Беларуссю. Маё станаўленне як асобы, як грамадзяніна ішло адначасова са станаўленнем



Рэспублікі Беларусь як самастойнай і незалежнай дзяржавы. Я жывы сведка таго, з чаго пачыналася наша суверэнная гісторыя дзяржаўнасці, з якіх пазіцый мы стартавалі на асколках разбуранай гіганцкай краіны — СССР і чаго мы дамагліся за 30 гадоў будаўніцтва сваёй нацыянальнай дзяржавы. І гэтая гісторыя трох дзесяцігоддзяў гераічнай і самаадданай працы беларускага народа на чале са сваім лідарам — Прэзідэнтам краіны Аляксандрам Рыгоравічам Лукашэнкам выклікае пачуццё гонару і бязмерную павагу за пакаленне людзей, якія здолелі за такі кароткі перыяд стварыць сучасную высокаразвітую дзяржаву, дзе забяспечаны фізічная і сацыяльная бяспека кожнага чалавека, створаны шырокія магчымасці для самарэалізацыі асобы, у якой шануюць і абараняюць гістарычную памяць, усяляк клапоцяцца аб ветэранах, пажылых людзях, інвалідах, сіротах, у якой у цэнтры дзяржаўнай палітыкі заўсёды знаходзіўся і знаходзіцца чалавек.

Старшыня профільнай камісіі адзначае: галасуючы на рэферэндуме і аддаючы свой голас за змены і дапаўненні ў Канстытуцыю, ён выразна ўсведамляе ступень сваёй датычнасці і адказнасці за будучыню роднай краіны, далейшае прагрэсіўнае і дынамічнае яе развіццё, за новы грамадскі дагавор, які закліканы стаць галоўнай стрыжнёвай апорай беларускай дзяржаўнасці на дзесяцігоддзі наперад.

Сенатар таксама азнаёміўся з арганізацыяй датэрміновага галасавання на рэферэндуме на ўчастках для галасавання Першамайскага, Савецкага і Заводскага раёнаў сталіцы.

***

**СТАРШЫНЯ Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Віктар ЛІСКОВІЧ таксама скарыстаўся сваім правам датэрміновага галасавання на рэспубліканскім рэферэндуме па пытанні ўнясення змяненняў і дапаўненняў у Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь.**

— Рэферэндум па ўнясенні змяненняў і дапаўненняў у Канстытуцыю, безумоўна, — адна з найважнейшых падзей у грамадска-палітычным жыцці Рэспублікі Беларусь. Яго вынікі шмат у чым вызначаць далейшае развіццё краіны і будучыню грамадзян, — перакананы сенатар.

Ён падкрэслівае: самы час праявіць сваю грамадзянскую актыўнасць — прыйсці на ўчастак для галасавання і выказаць сваё меркаванне адносна абноўленага Асноўнага Закона краіны.



— Па новай Канстытуцыі жыць нам і нашым дзецям. Кожны з нас павінен абавязкова скарыстацца сваім правам і прыняць удзел у рэферэндуме. Толькі мы самі можам вызначаць свой шлях развіцця, будаваць будучыню нашай краіны, нашу з вамі будучыню, — рэзюмуе Віктар Лісковіч.

**Вольга АНУФРЫЕВА, фота аўтара.**

Кіно па-за часам

# Ціхія зоры — для герояў

**Тэма вайны і супрацьстаяння ёй заўсёды была і застанецца прасторай для даследаванняў, пошуку натхнення і магчымасцю выказвацца майстрам у розных сферах: ад гісторыі да кіно і літаратуры. Проста кожны зробіць тое па-свойму. Прапануем звярнуць увагу на адзін з такіх фільмаў у эфіры тэлеканала «Беларусь 3».**



У суботу нас чакае кінапаказ ваеннай драмы «...А зоры тут ціхія» рэжысёра Станіслава Растоцкага, знятай па ўспамінах ... пайстагоддзя таму, у 1972 годзе. Кінастужка знятая па аднайменным творы Барыса Васільева. Дзеянне адбываецца ў 1942 годзе падчас Вялікай Айчыннай вайны ў далёкіх лясах Карэліі. У тыле раскватэраваны два аддзяленні ўзводу зенітных войскаў. Старшыні Фядоту Васкову даручаюць кіраўніцтва атрадам дзяўчат-дабравольцаў, якія маюць надзею на светлую будучыню. Яны мірна жылі ў лесе, пакуль не даведаліся, што побач з імі сярод балот і лясоў высадзіўся нямецкі дэсант... Як паведаміць пра гэта ў штаб? Маленькі атрад з сямі байцоў, адрэзаны ад сваіх, робіць усё магчымае, каб вырашыць няпростую задачу. Шэсць адважных жанчын і іх камандзір не маглі нават сабе ўявіць, што ім давядзецца дзейнічаць як антыдэверсійнай групе, але галоўнае — спыніць ворага любой цаной...

Варта адзначыць, што фільм быў зняты ў памяць пра медсястру, якая падчас вайны выратавала рэжысёра-франтавіка Станіслава Растоцкага ад смерці, калі вынесла яго з поля бою. І ў 1973 годзе кінастужку нават намінавалі на прэмію «Оскар» у катэгорыі «Найлепшы фільм на замежнай мове».

**Алена ДРАПКО.**

## ШАХМАТНЫ КЛУБ

Выпуск № 140

Сваю новую задачу даслаў наш чытач Мікалай Быкаў з вёскі Рэпічы Баранавіцкага раёна *(гл. дыяграму)*.




**Белыя:** Kpd1, Фе6, Ла2, Kd7, Kf1 (5).

**Чорныя:** Kpf4, Лf5, пп. d5, e4, g3, g4, g5 (7).

Мат за 2 хады.

Прапануем чытачам гэтую задачу для самастойнага рашэння. Дасылайце адказы на адрас рэдакцыі (вул. Хмяльніцкага, 10а, 220013, г. Мінск, «Звязда») або на электронны адрас вядучага аддзела: vadim_ne67@mail.ru

* * *

Абвешчаны юбілейны конкурс складання задач «Геннадзь Чумакоў — 80» у трох раздзелах: кааператыўны мат у 2, у 3 і ў шмат ходаў. Тэма вольная. Устаноўлены прызы і водгукі. Суддзя — Аляксандр Семяненка. Задачы дасылаць да 9.04.2022 на e-mail: chessproblem@mail.ru. Вынікі конкурсу будуць змешчаны на сайце http://selivanov.world і ў часопісе «Шахматная кампазіцыя» ў 2022 годзе.

* * *

Камісія па шахматнай кампазіцыі Федэрацыі шахмат Украіны аб'явіла міжнародны конкурс складання шахматных задач, прысвечаны памяці міжнароднага майстра па кампазіцыі, заслужанага майстра спорту і гросмайстра Украіны Рамана Фёдаравіча Залакоцкага. Раздзелы: мат за 2 хады, кааператыўны мат за 2 хады, кааператыўны мат за 3 хады (суддзя Анатоль Міцюшын), зваротны мат (суддзя Іван Сарока). Тэмы ва ўсіх раздзелах вольныя. Задачы адпраўляць да 3.05.2022 на e-mail: GlorytoUA@i.ua.

* * *

Міжнародны шахматны фестываль дваццаты раз адбыўся ў Оршы. У турніры «А» змагаліся 152 шахматысты: 66 з Беларусі, 75 з Расіі, 10 з Арменіі і 1 са Швецыі. Сярод іх — 5 гросмайстраў, 1 жаночы гросмайстар, 1 міжнародны майстар, 12 майстроў ФІДЭ, 1 жаночы майстар ФІДЭ. Перамог расійскі гросмайстар Мікіта Афанасьеў. 2—7 месцы падзялілі гросмайстры Міхаіл Мажараў, Аляксандр Маскаленка (Расія), Аляксей Аляксандраў (Беларусь), а таксама Сяргей Міхайлоўскі, майстры ФІДЭ Максім Царук (Беларусь) і Міхаіл Яшметаў (Расія).

У кругавым турніры «F» сярод 10 удзельнікаў былі 1 гросмайстар, 3 міжнародныя майстры (у тым ліку 1 жаночы), 5 майстроў ФІДЭ (з іх 2 — жаночыя). Перамогу атрымаў беларускі гросмайстар Віталь Цецераў. Прапануем дзве партыі з турніру.

Віталь Цецераў — Маргарыта Лысенка. 1. e4 c5 2. Kf3 d6 3. Cc4 Kf6 4. Фе2 Kc6 5. c3 Cg4 6. h3 C:f3 7. Ф:f3 g6 8. Cb3 Ch6 9. 0-0 0-0 10. Фе2 e5 11. d3 C:c1 12. Л:c1 Kh5 13. g3 Фg5 14. Ka3 Kph8 15. Kc4 Лad8 16. Фg4 Фh6 17. Ke3 Kg7 18. h4 f5 19. Фg5 Ф:g5 20. hg f4 21. Kg4 Kh5 22. Kpg2 Лde8 23. Лh1 Kd8 24. Kh2 Ke6 25. Kf3 fg 26. fg Kc7 27. a4 b6 28. Cc4 a6 29. b4 b5 30. ab ab 31. Cb3 cb 32. cb Ke6 33. Cd5 Kd4 34. K:d4 ed 35. Лhf1 h6 36. Л:f8+ Л:f8 37. gh Kph7 38. Ла6 Лf6 39. Лb6 Kp:h6 40. Л:b5 Лf8 41. Лb6 Kf6 42. Ce6 Лd8 43. b5 Kpg5 44. Лc6 Лb8 45. b6 Kg4 46. Л:d6 Ke5 47. Cc4 Kg4 48. Лd5+ Kpf6 49. Лb5 Ke5 50. b7 Kd7 51. g4 Kpe7 52. e5 Kf8 53. Kpf3 Kpd7 54. Kpe4 Kpc6 55. Kp:d4 Ke6+ 56. C:e6 Kp:b5 57. Cc8 Kpc6 58. Kpe4 g5 59. d4, 1:0.

Аляксандра Дзімітрава — Віталь Цецераў. 1. e4 c5 2. Kf3 e6 3. d4 cd 4. K:d4 a6 5. Cd3 Фс7 6. 0-0 Kf6 7. Фе2 d6 8. c4 Kbd7 9. f4 Ce7 10. Kc3 g6 11. f5 gf 12. ef e5 13. Kc2 b6 14. Cg5 Cb7 15. C:f6 K:f6 16. Ke4 C:e4 17. C:e4 Лc8 18. Ka3 b5 19. cb d5 20. Cc2 0-0 21. Cb3 e4 22. Kph1 Kph8 23. Kc2 Фе5 24. Лad1 Cd6 25. g3 Cc5 26. Ke3 d4 27. Kc4 Фе7 28. ba d3 29. Фg2 Лcd8 30. g4 e3 31. K:e3 Ф:e3 32. Лfe1 Фd4 33. h3 Лfe8 34. g5 Ke4 35. C:f7 Kf2+, 0:1.

* * *

Задача з мінулага выпуску рашаецца 1. Фd8. Першыя правільна адказалі Ігар Ананіч, Уладзімір Ізотаў, Фёдар Карпей, Віктар Жук, Сяргей Цяльпук, Васіль Жуковіч.

**Вадзім ЖЫЛКО.**



Сядзі і глядзі

# «Імправізацыя» да юбілею маэстра

**Сацыякультурны тэлеканал 26 лютага прадставіць тэлеаўдыторыі дакументальны фільм «Імправізацыя», прысвечаны прафесару, народнаму артысту Беларусі, кавалеру ордэна Францыска Скарыны Міхаілу Фінбергу, які 21 лютага мог бы адзначыць свой 75-гадовы юбілей.**





...Мазыр, 1947 год. У беднай яўрэйскай сям'і рабочага і прачкі нараджаецца пятае, позняе дзіця — Міша. Разруха пасляваеннага часу вымушае пару Фінбергаў зводзіць канцы з канцамі, але гэта не перашкаджае іх маленькаму сыну займацца музыкай. Наперакор бацькоўскаму неразуменню вечарамі напралёт на вуліцы ён грае то на скрыпцы, то на альце, то на баяне, то на трамбоне. Прычым вывучае гэтыя інструменты Міхаіл Якаўлевіч самастойна. Хлопчык яшчэ не ведае, што з гэтых імправізацый пачынаецца яго зорны шлях.

«...Я палюбіў музыку і ўбачыў, што можна складці з асобных гукаў. Але гэта быў толькі пачатак, а потым я пайшоў вучыцца. Паступаў у музычнае вучылішча восем разоў», — расказваў у інтэрв'ю Міхаіл Якаўлевіч. І настойлівасць хлопца дала вынік. Музыка стала яго спадарожніцай на ўсё жыццё. А сам ён дапамог узлятаць у прафесіі многім артыстам, якія працавалі ў розныя часы ў Нацыянальным акадэмічным канцэртным аркестры Беларусі. У іх памяці ён застаўся, мабыць, прынцыповым прафесіяналам з неўтаймаванай энергіяй, які заўсёды быў гатовы дапамагчы і падтрымаць сапраўды таленавітых людзей.

Аўтары новага дакументальнага фільма «Імправізацыя» разам з блізкімі сябрамі і калегамі, аднакурснікамі і вучнямі Міхаіла Фінберга ўспомняць усе ключавыя этапы жыцця мэтра беларускай музыкі, пагартаюць старонкі школьнага журнала 1954 года і прагуляюцца па вуліцы, дзе знаходзілася бацькоўская хата артыста. У тэлевізійных архівах адшукаюць унікальныя запісы часоў працы ў цыркавым аркестры, згадаюць першыя тэлепраграмы, фестывалі і гастролі заслужанага калектыву Нацыянальнага акадэмічнага канцэртнага аркестра Беларусі, з якім маэстра жыў, тварыў і ўражваў амаль паўжыцця. Даведаюцца, якую ролю ў творчасці Міхаіла Якаўлевіча сыгралі джазмены Эдзі Рознер і Барыс Райскі і як у 1971-м мінскі канцэрт Дзюка Элінгтана паўплываў на маладога дырыжора і яго сцэнічны вобраз.

— У Мінску, Мазыры, Віцебску і Маладзечне каманда тэлеканала сабрала мноства дзіўных, а галоўнае, жывых успамінаў: 17 інтэрв'ю, 700 хвілін — іх хапіла б на паўнавартасны цыкл фільмаў! Настолькі вялікая і самабытная постаць прафесара, — распавядае сцэнарыст фільма Надзея Габец. — Пашчасціла сустрэцца з гісторыкам музыкі Вольгай Дадзіёмавай, якая вывучала еўрапейскія архівы і па сціплых фрагментах нотных запісаў аднаўляла спадчыну беларускіх кампазітараў мінулага. Дзякуючы ёй напрацоўкам, сёння мы слухаем класікаў у выкананні музыкантаў Міхаіла Фінберга. Рэжысёр Павел Быкаў у 70-я гады працаваў у мінскім цырку. Ён падзяліўся кранальнымі і нават смешнымі закулiснымі гісторыямі. Напрыклад, з якімі намаганнямі Міхаіл Якаўлевіч, учарашні выпускнік кансерваторыі, у свае дваццаць тры здолеў знайсці кантакт з няпростымі музыкантамі цыркавога аркестра, удвая старэйшымі за яго. Як маэстра працаваў са знакамітымі клоўнамі Нікуліным, Паповым і Карандашом і чаму месяц не мог адмыць рукі ад новага кажуха.

Прэм'ерны паказ фільма «Імправізацыя» выйдзе ў эфір 26 лютага ў 21:05 на тэлеканале «Беларусь 3». Адразу пасля яго гледачоў чакае тэлеверсія канцэрта-прысвячэння Міхаілу Фінбергу «Асоба і аркестр» да 75-годдзя дырыжора і 35-годдзя Нацыянальнага акадэмічнага канцэртнага аркестра.

Сваё кіно

# «ВЯНОК САНЕТАЎ»

**У наступную пятніцу, 4 сакавіка, на тэлеканале «Беларусь 3» пакажуць героіка-рамантычную аповесць «Вянок санетаў», зняту Валерыем Рубінчыкам у 1976 годзе.**

Фільм распавядае пра двух хлопчыкаў, выхаванцаў музычнага ўзвода, Арцёма і Івана, якія ўцякаюць з вучылішча і прабіраюцца на фронт у канцы вайны. А падчас сваіх гераічных прыгод сустракаюць на сваім шляху розных людзей, якія імкнуцца выратаваць іх ад выпадковай смерці. Пасля ж у вакзальнай мітусні прыфрантавога гарадка дзеці губляюць адзін аднаго. Іван з'язджае з капітанам Трацяком, а Арцём знаёміцца з лётчыкам Валодзем, танкісткай Анютай, ваенным журналістам Пажарскім і яфрэйтарам Ампілогавым, з якімі яму наканавана пайсці ў свой першы бой у апошні дзень вайны...

## панядзелак, 28 лютага

### Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 18.15, 1.05** Зона Х (16+).
**9.10** Галоўны эфір.
**10.40, 12.10, 18.30, 19.20 Драма «Горад нявест» (16+).**
**13.05, 15.25 Драма «Чыстая псіхалогія» (16+).**
**15.10, 18.00** Навіны рэгіёна.
**17.05** Беларускі час.
**21.00** Панарама.
**21.45** Зразумелая палітыка.
**22.00 Серыял «След» (16+).**
**0.50** Арэна.
**1.25** Дзень спорту.

### Беларусь 2

**6.00** «Уключайся!» (12+)
**9.00, 10.55, 21.05** Тэлебарометр.
**9.05, 19.55** «Зразумець. Дараваць» (16+).
**10.10** «На тыдзень» (16+).
**11.30** «Кніга жыцця» (12+).
**13.05** «Усёй сям'ёй» (6+).
**13.50** Навукова-фантастычны фільм «Марсіянін» (12+).
**16.15** «Тры першыя спатканні» (16+).
**17.05 Камедыя «Вялікі год» (12+).**
**18.55** «На кручку» (16+).
**21.10** Спортлато 6 з 49, КЕНА.
**21.20 Серыял «Жаночы доктар-5» (16+).**
**22.20** Хачу ў тэлевізар!
**22.25 Серыял «Такая работа» (16+).**
**0.20** «Экстрасэнсы-дэтэктывы» (16+).

### Беларусь 3

**7.00** «Дабраранак».
**7.35, 12.10** «Беларуская кухня».
**8.05, 12.00, 15.35, 20.30, 23.40** Навіны культуры.
**8.15, 17.35 «Без асобай рызыкі». Маст. фільм (12+) [СЦ].**
**9.35** «Нацыянальны хіт-парад».
**10.25** «Архітэктура Беларусі».
**10.40 «Дзяўчына з характарам». Маст. фільм (12+) [СЦ].**
**12.40** «Суразмоўцы».
**12.55** «Наперад у мінулае».
**13.25, 21.05** «Апошні дзень» (12+) [СЦ].
**14.05, 21.40 «Трэмбіта». Маст. фільм (12+) [СЦ].**
**15.45** «Навукаманія» (6+).
**16.15 «Бландзінка за вуглом». Маст. фільм (12+).**



**18.55** Святочны канцэрт, прысвечаны Дню абаронцаў Айчыны і Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь.
**20.40** «Калыханка» (0+).
**23.15** «Кафедра».

### Беларусь 5

**7.00** Азбука спорту.
### Беларусь 2

**6.00** «Уключайся!» (12+)
**9.00, 18.10** Тэлебарометр.
**9.05 Серыял «Сляпая» (16+).**
**10.10** «Экстрасэнсы-дэтэктывы» (16+).
**11.05 Серыял «Такая работа» (16+).**
**12.55** «Сямейныя гісторыі» (16+) [СЦ].
**13.30 Серыял «Жаночы доктар-5» (16+).**
**14.30** «Арол і рэшка. Цуды свету-3» (16+).
**15.30** Анімацыйны серыял «Качыныя гісторыі» (0+).
**15.55** Нічога сабе ньюз (12+).
**16.00** «ПІН_КОД» (12+).
**16.55** «Вежа» (12+).
**17.50** М/с «Кузуркі» (0+).
**18.15** «На нажах» (16+).
**19.10 «Клон». Серыял (16+).**
**20.10, 21.15** «Тата папаў» (16+).
**21.10** Спортлато 5 з 36, КЕНА.
**22.15** «Вяселле ўсляпую» (16+).

### Беларусь 3

**7.00** «Дабраранак».
**7.35** «Беларуская кухня».
**8.05, 12.00, 15.50, 20.30, 23.35** Навіны культуры.
**8.15, 19.00 «Агарова, 6». Маст. фільм (12+) [СЦ].**
**9.40** «Люблю і памятаю».
**10.20, 13.00, 17.15** «Архітэктура Беларусі».
**10.30, 17.30 «Вянок санетаў». Маст. фільм (12+) [СЦ].**
**12.10** «Сіла веры».
**12.40** «Жывая спадчына».
**13.20, 21.40 «Чырвоная каралева». Серыял (16+) [СЦ].**
**15.10, 21.05** «Легенды кіно» (12+) [СЦ].
**16.00** «Я хачу гэта ўбачыць!» (6+)
**16.25** «Кадры жыцця».
**20.40** «Калыханка» (0+).

### Беларусь 5

**6.50** Лёгкая атлетыка. Спартыўная хада. Камандны чэмпіянат свету. Жанчыны. Мужчыны (U-20).
**9.00** Біятлон. Кубак свету. Жанчыны.
**10.25** Свет англійскай прэм'ерлігі. Відэачасопіс.
**10.55** Хакей. КХЛ. Усходняя канферэнцыя. «Металург» (Магнітагорск) — «Барыс» (Нур-Султан).
**12.55** Фактар сілы.
**13.25** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Агляд.
**14.25** Авертайм.
**15.00** Лёгкая атлетыка. Спартыўная хада. Камандны чэмпіянат свету. Жанчыны.
**16.30** Біятлон. Кубак свету. Мужчыны.
**17.50** Дзюдо. Кубак А. Мельнікава.
**19.20** Хакей. КХЛ. Заходняя канферэнцыя. СКА (Санкт-Пецярбург) — «Дынама-Мінск».
**21.50, 23.55** Тэніс. WTA.
**23.45** Спорт-цэнтр.

### АНТ

**6.00, 7.10, 8.10, 9.10** «Наша раніца».
**6.30, 7.00, 7.30, 8.00, 8.30, 10.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00** [СЦ], **20.30, 0.55** Нашы навіны.
**10.00** «Жыць здарова!» (16+)
**11.15** «Модны прыгавор» (6+).
**12.20** «Бесталковыя нататкі» (12+).
**13.15, 0.15 Серыял «Яна не магла інакш» (12+).**
**15.00** «Давай пажэнімся!» (16+)
**16.20** «Трывожная кнопка» (16+).
**16.45** «Мужчынскае / Жаночае» (16+).
**18.20** «Удача ў прыдачу!» з «Еўраопт».
**19.20** «Няхай гавораць» (16+).
**20.00** Час.
**21.15 «Янычар». Серыял (16+).**
**22.20** «Дзве зоркі. Бацькі і дзеці» (12+).

### СТБ

**6.00, 6.40, 7.45, 8.40** «Раніца СТБ».
**6.30** [СЦ], **7.30** [СЦ], **8.30** [СЦ], **10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** Навіны «24 гадзіны».
**9.00, 0.00** «Загадкі чалавецтва з Алегам Шышкіным» (16+).
**9.50** «Глядзець усім!» (16+)
**10.40** «Як уладкаваны свет» (16+).
**12.20, 20.40, 0.45** «Самыя шакавальныя гіпотэзы» (16+).
**13.45, 23.10** «Таямніцы Чапман» (16+).
**14.35, 21.35** «Неверагодна цікавыя гісторыі» (16+).
**15.30, 16.50 «Кат». Серыял (16+).**
**20.10, 23.05** «СТБ-спорт».
**20.15** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.25** «Міншчына».

### МІР

**5.00, 15.05** «Справы судовыя. Новыя гісторыі» (16+).
**5.15** «Наша кіно. Гісторыя вялікай любові» (12+).
**5.55 Мастацкі фільм «Гусарская балада» (12+).**
**7.40, 10.20 Серыял «Свае» (16+).**
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Навіны (бягучы радок).
**10.10** «У гасцях у лічбы» (12+).
**13.15** «Справы судовыя. Грошы вярніце!» (16+)
**14.10, 16.20** «Справы судовыя. Бітва за будучыню» (16+).
**17.30 Мастацкі фільм «Сардэчна запрашаем, або Пабочным уваход забаронены».**
**19.15** «Слабае звяно» (12+).
**20.15** «Гульня ў кіно» (12+).
**21.00 Маст. фільм «Чалавек з бульвара Капуцынаў» (16+).**
**23.00 Мастацкі фільм «Новыя амазонкі» (16+).**
**0.40 Мастацкі фільм «Папса» (16+).**
**2.40 Мастацкі фільм «Вясна» (12+).**
**4.20** Мультфільмы.

### РТР—Беларусь

**6.05** «Новая раніца».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.30** «Аб самым галоўным» (12+).
**12.35** «Кропкі над і» (16+).
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**14.30** «60 хвілін» (12+).
**15.55, 17.30 Серыял «Зачэпка» (16+).**
**18.40** «Малахаў» (16+).
**21.05 Серыял «Лінія святла» (12+).**
**23.10 Фільм «Рэха граху» (12+).**

### НТБ—Беларусь

**6.05** «Астрапрагноз».
**6.10, 7.25, 8.20, 16.35, 19.50, 22.10, 23.35** Сёння. Галоўнае.
**6.15 Серыял «Масква. Тры вакзалы» (16+).**
**7.05** Сфера інтарэсаў.
**7.40** «Зламаць стэрэатыпы» (12+).
**8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**8.35, 22.15** «НЗ.by».
**8.55** Пракурорская праверка (16+).
**10.25 Баявік «Марскія д'яблы. Смерч» (16+).**
**13.25** Надзвычайнае здарэнне.
**13.50** «Новыя рускія сенсацыі» (16+).
**14.50** «ДНК» (16+).
**16.50** «Чакай мяне» (12+).
**17.50 Дэтэктыў «Пёс» (16+).**
**20.05, 22.45 Дэтэктыў «Першы аддзел» (16+).**
**0.00 Фільм «Маё апошняе першае каханне» (16+).**

### 8 канал

**7.00, 15.10, 18.55, 21.00, 1.15** «Надвор'е» + «Эрана».
**7.05** Мультпарад «Качыныя гісторыі».
**7.30, 15.15, 20.45** «Прыколы 13-й школы» (6+).
**7.35 Серыял «Дзяцінства Шэлдана».**
**8.15, 10.50 Драма «Забытае» (16+).**
**10.00 Серыял «Японія».**
**12.35** «Драйв выжывання» (Формула адзін).
**13.10 Серыял «Полдарк» (16+).**
**16.10** «Гатуй як шэф».
**16.20 Серыял «Крамлёўскія таямніцы» (16+).**
**19.00 Драма «Збор» (16+).**
**20.50** «Вечарніца».
**21.05 Баявік «Сны, пасланыя з глыбінь» (12+).**
**23.40 Камедыя «Адпетыя махляркі» (16+).**





## серада, 2 сакавіка

### ВТБ

**6.05** «Лаві момант» (16+).
**7.00, 9.00** «Раніца з гумарам» (16+).
**11.00, 22.50** «КВЗ. Панашаму» (16+).
**12.00** «Наш рамонт» (16+).
**12.30** «Дурні і дарогі» (16+).
**13.20** Серыял «Апошні з Магікян» (16+).
**14.20, 18.30** Серыял «Філатаў» (16+).
**15.50** Серыял «Міша ўсё псуе» (16+).
**16.50, 0.55** «Форт Баярд» (16+).
**20.00** Серыял «#СеняФедзя» (16+).
**21.00** Жахі «Яга. Кашмар цёмнага лесу» (16+).
**0.00** Серыял «Каманда Б» (16+).
**2.25** Серыял «Кадэцтва» (12+).



**4.00** «Адна за ўсіх» (16+).
**5.10** «6 кадраў» (16+).

### Культура

**6.30, 7.00, 7.30, 8.30, 10.00, 15.00, 19.30, 23.20** Навіны культуры.
**6.35** Пешшу...
**7.05, 20.05** Правілы жыцця.
**7.35, 0.25** Сусвет. Серыял [СЦ].
**8.35** Лібрэта.
**8.50, 16.35** «Сонечны вецер». Маст. фільм.
**10.15** «Назіральнік».
**11.10** XX стагоддзе.
**12.00** Першыя ў свеце.
**12.20, 22.10** «Трэст, які лопнуў». Маст. фільм [СЦ].
**13.30** Штучны адбор.
**14.15, 23.40** «Гутаркі аб рускай культуры» [СЦ].
**15.05** Навіны. Падрабязна. Кіно.
**15.20** «Біблейскі сюжэт».
**15.50** Белая студыя.
**17.50, 1.20** Гідон Крэмер і сябры.
**18.30** Лінія жыцця [СЦ].
**19.45** «Галоўная роля».
**20.30** Добрай ночы, малыя!
**20.45** «Абсалютны слых».
**21.25** Улада факта.
**2.00** Павел Чалішчаў. Няцотнакрылы анёл. Дак. фільм.

### Настальгія

**6.00** «СеваАлогія» (18+).
**6.55, 8.30, 9.40, 11.00, 13.00, 14.35, 15.40, 17.00, 20.45, 21.40, 23.00** Музычная настальгія (12+).
**7.10** Мастацкі фільм «Залата партыі» (18+).



**9.00, 15.00, 21.00, 3.00** «Мінулы час» (12+).
**10.00, 16.00, 22.00, 0.00** «Народжаныя ў СССР».
**12.00** «Быў час» (12+).
**13.15** Мастацкі фільм «Лаўкач і хіпоза» (18+).
**18.00** «Спяем, сябры!» (12+)
**19.00** Мастацкі фільм «Ашалелы аўтобус» (18+).
**1.05** «Дамісолька» — Алімпіяда нашага двара» (12+).
**3.45** Мастацкі фільм «Дурная» (18+).

### EuroSport 1

**2.00, 13.30** Веласпорт. Гран-пры. Мужчыны (16+).
**3.00** Веласпорт. Тэлечасопіс Cycling Show (16+).
**3.30, 7.00. 18.40** Скачкі на лыжах з трампліна. КС. Мужчыны (16+).
**5.00, 10.30, 15.00, 15.45, 20.45, 21.45** Снукер. Welsh Open (6+).
**8.30** Горныя лыжы. КС. Мужчыны (16+).
**9.30, 19.50** Веласпорт. Гран-пры. Жанчыны (16+).
**12.30** Веласпорт. Геймінг ЧС. Рэв'ю (16+).
**19.45, 21.40** Навіны (16+).

### Кінакамедыя

**0.50** Прышэльцы ў Амерыцы (6+).
**2.45** Высокі бландзін у чорным чаравіку (12+).
**4.25** Ілюзія падману (16+).
**6.30** Васабі (16+).



**8.15** Немаўля на прагулцы, або Паўзком ад гангстараў (6+).
**10.05** Практычная магія (16+).
**12.00** Утаймаванне свавольнага (16+).
**14.00** Сутэнёр (16+).
**15.45** Джуманджы (6+).
**17.35** Кракадзіл Дандзі (12+).
**19.30** Кракадзіл Дандзі-2 (6+).
**21.35** Сябравацъ па-руску! (18+)
**23.25** Куленепрабівальны (12+).

### ТБ3

**6.00** Калекцыя «Беларусьфільма» (12+).
**9.45** «Гадзіннік кахання» (16+).
**10.40** «Перыскоп» (16+).
**11.00** «Вялікая маленькая хлусня». Серыял (16+).
**12.15, 18.10** «Знакі лёсу» (16+).
**12.55, 17.00** «Старац» (16+).
**14.05, 18.50** «Сляпая» (16+).
**15.15, 20.00** «Варажбітка» (16+).
**16.25** «Цуд» (12+).
**21.10** «Навігатар» (16+).
**22.15** «Мая» (16+).
**23.20** «Дзённік экстрасэнса» (16+).
**0.20** «Лінія абароны» (16+).
**0.50** «Зялёная міля» (16+).
**3.50** «Развітанне» (16+).
**4.30** «Суд ідзе». Серыял (16+).

### ТБ1000

**5.00, 5.40, 17.15, 18.05** Элементарна (16+).
**6.30** Джэк — пакарыцель веліканаў (12+).
**8.35** Тарзан. Легенда (16+).



**10.30** Змярканне (16+).
**12.45** Змярканне. Сага. Маладзік (12+).
**15.05** Змярканне. Сага. Зацьменне (16+).
**19.00** Змярканне. Сага. Світанак: частка 1 (12+).
**21.00** Змярканне. Сага. Світанак: частка 2 (12+).
**23.00** Цяпло нашых цел (12+).
**0.45** Успаміны аб будучыні (16+).
**2.50** Дыхай дзеля нас (16+).

### ТБ1000 Рускае кіно

**5.40** Пра любофф (16+).
**8.05** Змешаныя пачуцці (16+).
**9.35** Лёгкі на ўспамін (12+).
**11.05** Тэрмінова выйду замуж (16+).
**13.05** Нявеста любой цаной (16+).
**14.55** Без мяне (16+).
**16.35** Кома (16+).
**18.35** Лаві момант (16+).
**20.00** Кахае не кахае (16 +).
**21.30** Пра што маўчаць дзяўчаты (12+).
**23.00** Кахай іх усіх (18+).
**0.50** Стэндап пад прыкрыццем (16+).
**2.35** Начныя вартавыя (12+).
**4.10** Галасы Вялікай краіны (6+).

### National Geographic

**6.00, 5.35** Навуковыя глупствы (16+).
**6.25** Панарама 360 градусаў (16+).
**7.15, 8.10** Падарожжы з Горданам Рамзі (16+).
**9.00, 9.50** Інстынкт выжывання (16+).
**10.45, 21.00, 23.35, 0.25, 3.30** Дзікі тунец: Поўнач супраць Поўдня (16+).
**11.40** Дзікі тунец (16+).
**12.25, 16.45** Неверагодныя цуды тэхнікі (16+).
**13.20, 14.10, 17.40** Аўта-SOS (16+).
**15.00** Служба бяспекі аэрапорта (16+).
**15.55** Злавіць кантрабандыста (16+).
**18.30, 18.50** Фабрыка ежы (16+).
**19.20** Расследаванні авіякатастроф (16+).
**20.10** Аляска: новае пакаленне (16+).
**21.50** Нязведаныя воды з Джэрэмі Уэйдам (16+).
**22.40** У дзікай прыродзе з Беарам Грылсам (16+).
**1.10** Тайная гісторыя караблекрушэнняў (16+).
**1.55, 2.40** Асушыць акіян (16+).
**4.15** Міжнародны аэрапорт Дубай (16+).
**5.00** Гульні розуму (16+).

### Discovery

**8.00, 7.35** Багажныя войны.
**8.25, 16.40, 22.10** Махінатары.
**9.20, 9.45, 20.20, 20.45** Бітва за нерухомасць.
**10.15, 10.40, 21.15, 21.40** Як гэта зроблена?
**11.10, 19.25, 4.27** Хуткія і гучныя.
**12.05** Упершыню на вяршыні свету.
**13.55, 14.50, 15.45** Паміж небам і зямлёй.
**17.35** Круты цюнінг.
**18.30** Іржавая імперыя.
**23.05, 5.14** Эд Стафард: гульня на вылет.
**0.00, 6.01** Голыя і напалоханыя.
**0.55, 1.20, 6.48, 7.12** Дзіўны свет жывёл.
**1.50, 2.15, 2.45, 3.10, 3.40, 4.04** Як гэта ўладкавана?

*У праграме магчымы змяненні. Перадрукоўка праграмы забаронена. [СЦ] – фільм транслюецца са скрытымі субцітрамі.*

# БЕЛАРУСЫ ЗРОБЯЦЬ ПРАВІЛЬНЫ ВЫБАР

**УПЭЎНЕНЫ член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці прарэктар па вучэбнай частцы Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. А. Куляшова Алег ДЗЯЧЭНКА:**



— За гады незалежнасці наша краіна дамаглася прыкметных поспехаў ва ўмацаванні нацыянальнай дзяржаўнасці і пабудове сацыяльна арыентаванай рынкавай эканомікі, — кажа сенатар. — У грамадстве сфарміраваўся паўнавартасны сярэдні клас, аб чым наглядна сведчыць узровень матэрыяльнага дабрабыту грамадзян, які вырас, а палітычная сістэма дэманструе ўсяму свету ўстойлівасць і здольнасць да далейшага прагрэсіўнага развіцця.

Суразмоўнік звяртае ўвагу: надыходзіць новы этап якаснага пераўтварэння грамадства — рэспубліканскі рэферэндум. Ён выказаў упэўненасць, што суайчыннікі вельмі адказна паставіліся да абмеркавання змяненняў і дапаўненняў Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь.

— Доказам гэтаму служаць тысячы прапаноў, якія паступілі ад неабыякавых грамадзян, парламентарыяў, грамадскіх арганізацый і палітычных партый, працоўных калектываў, спецыялістаў у галіне канстытуцыйнага права падчас правядзення дыялогавых пляцовак, круглых сталоў і інфармацыйных сустрэч. Таму рэферэндум па прыняцці сапраўды народнай Канстытуцыі адбудзецца, і, несумненна, гэта ўжо гістарычны факт, — перакананы Алег Дзячэнка.

Сенатар акцэнтуе: беларускі народ заўсёды падтрымліваў ініцыяваныя дзяржавай прапановы, пакольki яны адлюстроўвалі яго глыбінныя спадзяванні і інтарэсы.

— Згадаем хоць бы цудоўныя вынікі галасавання на рэспубліканскіх рэферэндумах, якія прайшлі ў 1995, 1996 і 2004 гадах, калі ў сярэднім 80,9 % выбаршчыкаў выказаліся за змяненне дзяржаўнай сімволікі, наданне рускай мове дзяржаўнага статусу, эканамічны саюз з Расійскай Федэрацыяй, дапаўненні ў Канстытуцыю 1994 года і па іншых жыццёва важных для ўсіх нас пытаннях, — нагадвае гісторык.

Суразмоўнік робіць выснову, што маштабы ўсенароднага абмеркавання праекта Асноўнага Закона, у які ўсё грамадства было паглыблена ў сёлетнім студзені, сведчаць пра тое, што беларусы прыйдуць на ўчасткі для галасавання і зробяць правільны выбар на карысць сваіх дзяцей і ўнукаў, вызначыўшы магістральныя шляхі развіцця беларускага грамадства і дзяржавы на многія дзесяцігоддзі наперад.

# ЗАЛОГ ПАСПЯХОВАЙ БУДУЧЫНІ

## У клопаце аб моладзі і імкненні да захавання гістарычнай памяці

**ТАК лічыць член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі, мастацкі кіраўнік народнага цырка імя В. Абеля Палаца культуры «Касцюкоўка» (г. Гомель) Таццяна АБЕЛЬ:**

— Рэферэндум — важны механізм непасрэднай дэмакратыі, — кажа сенатар. — Сёння беларусы маюць магчымасць выбраць, якой будзе наша краіна, узровень і якасць жыцця.

І важна ва ўсім гэтым улічыць інтарэсы і галасы моладзі.

— На працягу ўсёй суверэннай гісторыі мы падтрымліваем беларускую моладзь, даём ёй магчымасць для самарэалізацыі, прыслухоўваемся да яе ідэй і думак, — упэўнена Таццяна Абель. — Сутыкаючыся штодня ў сваёй дзейнасці з моладдзю ў сферы культуры, я з упэўненасцю магу сказаць, што ў нас у краіне створана паўнавартасная сістэма падтрымкі таленавітай моладзі.

Яна нагадвае: ужо дзейнічаюць розныя фонды, вылучаюцца гранты, прысуджаюцца спецыяльныя прэміі і стыпендыі. Ёсць магчымасць у кожнага, незалежна ад месца жыхарства і ўзроўню даходаў, развіваць свой талент і рэалізоўвацца.

Сенатар звяртае ўвагу, што ў праекце змяненняў і дапаўненняў у Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь з'явіцца новы артыкул 32, які замацуе магчымасць духоўнага, маральнага, інтэлектуальнага і фізічнага развіцця моладзі.

Яшчэ адзін важны, з пункту гледжання суразмоўніцы, асабліва для выхавання маладога пакалення, дапоўнены артыкул 54, дзе будуць замацаваны абавязкі кожнага грамадзяніна нашай краіны па захаванні гістарычнай памяці.

— Гэтыя змены, спадзяюся, 27 лютага будуць падтрыманы ўсім беларускім народам, бо гэта — жыццёвая неабходнасць. Таму што клопат аб моладзі і імкненне да захавання гістарычнай памяці — залог нашай паспяховай будучыні, — перакананa Таццяна Абель. — А значыць, унясенне гэтых змяненняў і дапаўненняў у Канстытуцыю дасць яшчэ больш магчымасцяў для самарэалізацыі, творчага росту і развіцця моладзі.

Яна падкрэслівае: наспеў той час, калі мы павінны рэалізаваць увесь назапашаны вопыт і прагаласаваць на рэспубліканскім рэферэндуме за дабрабыт, годнае жыццё нашых дзяцей і за нашу будучыню.

# Усвядомлены выбар кожнага

**НАМЕСНІК старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Дзмітрый БАСКАЎ аб рэспубліканскім рэферэндуме, які пройдзе 27 лютага:**

— Удзел у рэферэндуме павінен быць усвядомленым выбарам кожнага беларуса. Для мяне гэта перш за ўсё магчымасць прыняць удзел у вызначэнні далейшай траекторыі развіцця нашай краіны.

Гэта асабліва важна яшчэ і таму, што я хачу быць упэўненым: маіх дзяцей чакае мірная будучыня ў краіне, якая ўстойліва развіваецца, дзе з павагай ставяцца да вопыту старэйшых пакаленняў і берагуць памяць аб іх подзвігу, дзе сямейныя каштоўнасці вызначаюцца не моднымі тэндэнцыямі, а маральнымі нормамі, уласцівымі нашаму грамадству.

Менавіта таму я прагаласую за прапанаваныя змены, бо яны дапамогуць нам усім ганарыцца краінай, у якой мы жывём.

# Дзяржпадтрымка і сацыяльная накіраванасць застаюцца ў прыярытэце

**СТАРШЫНЯ Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Віктар ЛІСКОВІЧ:**

— У новым праекце Канстытуцыі прыярытэтнымі застаюцца дзяржаўная падтрымка і сацыяльная накіраванасць, — адзначыў старшыня профільнай камісіі Савета Рэспублікі.

Ён звяртае ўвагу, што, нягледзячы на агульнасусветныя тэндэнцыі, у Беларусі захоўваюцца бясплатныя адукацыя і медыцынскае абслугоўванне. У прыярытэце па-ранейшаму — падтрымка мацярынства, бацькоўства і дзяцінства, асаблівы клопат пра людзей сталага ўзросту і інвалідаў.

Сенатар акцэнтуе ўвагу, што ў новым праекце Асноўнага Закона краіны асаблівая ўвага — выхаванню традыцыйных сямейных каштоўнасцяў. Сям'я як асноўны элемент грамадства была і застаецца захавальніцай чалавечых каштоўнасцяў, культуры і гістарычнай пераемнасці пакаленняў, фактарам стабільнасці і развіцця.

— Дабрабыт і моц сям'і — вось мера развіцця і стабільнасці краіны, — лічыць Віктар Лісковіч. — Любую дзяржаву можна разбурыць без адзінага стрэлу, калі падмяніць у яе грамадзян каштоўнасці і традыцыі на лжывыя. Менавіта таму ў мэтах недапушчэння скажэння фундаментальных, асноватворных каштоўнасцяў грамадства, у ліку якіх сям'я, дзеці і дэмаграфічная бяспека, у новым праекце Канстытуцыі, артыкуле 32, канкрэтызуецца паняцце шлюбу як саюза жанчыны і мужчыны.

Ён адзначае, што гэтыя грамадскія каштоўнасці ўжо апынуліся пад ударам у іншых краінах, якія спрабуюць навязаць усім сваю так званую прагрэсіўную мадэль развіцця, руйнуючы інстытут сям'і і маральныя асновы грамадства.

— Слабенне інстытута сям'і прыводзіць да росту попыту на міграцыю, росту і амаладжэння злачыннасці. Павялічваецца колькасць дзяцей, якія выхоўваюцца па-за сям'ёй або ў няпоўнай сям'і, з'яўляюцца новыя «сацыяльныя вірусы» — мода на бяздзетнасць, аднаполыя шлюбы і, як вынік, дэмаграфічныя праблемы, — перакананы старшыня профільнай камісіі Савета Рэспублікі.

Ён нагадвае аб сусветным вопыце, які прадэманстраваў, што адступленне ад нацыянальных духоўна-маральных традыцый прыводзіць да дэградацыі грамадства, да страты незалежнасці і нацыянальных катастроф.

— Дзякуючы нашай згуртаванасці, яднанню, калектывізму і ўласнай падтрымцы дзяржавы наша краіна зможа стаць сусветным лідарам у захаванні традыцыйных сямейных каштоўнасцяў, лідарам у захаванні, падтрымцы і ўмацаванні інстытута сям'і, у вырашэнні дэмаграфічных праблем, — выказаў упэўненасць Віктар Лісковіч.

Ён перакананы, што ўсе зацікаўлены ў тым, каб сем'і былі шчаслівыя, дзяржава — развівалася, а людзі адчувалі сябе абароненымі.

— А значыць, абавязак кожнага грамадзяніна нашай краіны — прыйсці на рэферэндум і пацвердзіць свае намеры будаваць і далей свабодную суверэнную незалежную дзяржаву, — заклікаў сенатар.

# РЭАЛЬНАЯ МАГЧЫМАСЦЬ ПАЎПЛЫВАЦЬ НА ВЫНІК

**ЧЛЕН Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці, дырэктар дзяржаўнай установы адукацыі «Сярэдняя школа № 14 г. Маладзечна» Каліна КАПУЦКАЯ:**

— Рэферэндум — гэта найважнейшы інстытут прамой дэмакратыі, які ўяўляе сабой непасрэдна правятворчасць народа, — перакананa сенатар. — Гэта адзін са спосабаў удзелу грамадскасці, гэта значыць нас з вамі, у прыняцці рашэнняў, асабліва важных для дзяржавы і кожнага з нас.

Суразмоўніца нагадвае: краіна знаходзіцца на парозе новага этапу свайго развіцця, які патрабуе чарговай змены Асноўнага Закона Рэспублікі Беларусь.

— Праект абноўленай Канстытуцыі, распрацаваны з улікам міжнароднай і ўнутрыпалітычнай сітуацыі, забяспечвае абарону асноўных правоў грамадзяніна краіны ў сучасных умовах. Акрамя таго, у ім улічваецца вопыт развіцця Беларусі як суверэннай дзяржавы, — перакананa Каліна Капуцкая.

Яна адзначае, што вопыт дзяржаўнага будаўніцтва, сацыяльнай роўнасці і сацыяльнай накіраванасці дзяржаўнай палітыкі, падтрымка навукі, інавацый і адукацыі, павага да сваёй гісторыі і подзвігу беларускага народа — усё гэта неабходна захаваць для наступных пакаленняў.

— Таму ў праект уключаны шэраг палажэнняў, якія датычацца сацыяльнай палітыкі, інавацыйнай сферы, захавання нацыянальнай самабытнасці і гістарычнай памяці, выхавання традыцыйных сямейных каштоўнасцяў, забеспячэння сацыяльнай справядлівасці, — падкрэслівае яна.

Сенатар звяртае ўвагу: рэферэндум па ўнясенні змяненняў і дапаўненняў у Канстытуцыю — важная палітычная падзея. Прыняць у ім удзел — не толькі грамадзянскі абавязак.

— Прыйсці і аддаць свой голас за мірную і спакойную будучыню трэба проста па загадзе душы, бо ўсе важныя рашэнні ў краіне заўсёды прымаліся ўсеагульным галасаваннем, калектыўна. Таму і на рэферэндуме мы павінны прадэманстраваць адзінства і мудрасць беларускага народа, клопат аб будучых пакаленнях, — заклікае Каліна Капуцкая. — Бо менавіта ад нас залежыць развіццё і росквіт роднай Беларусі.

**Сяргей РАЧКОЎ:**

# «БЯСПЕКА САЮЗНАЙ ДЗЯРЖАВЫ — СПАЛУЧЭННЕ АБАРОНЫ І ЗНЕШНЯЙ ПАЛІТЫКІ»

## Сенатар расказаў, ад чаго залежыць стабільнасць рэгіёна і свету ў цэлым

**Днямі старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Сяргей Рачкоў прыняў удзел у міжнароднай канферэнцыі «Бяспека і эканамічны суверэнітэт Саюзнай дзяржавы», на якой падзяліўся сваім бачаннем працэсаў, якія адбываюцца ў свеце.**



### Узаемавыгаднае ваеннае супрацоўніцтва

Паводле меркавання сенатара, важнае месца ў сістэме ўзаемадзеяння Беларусі і Расіі займаюць пытанні рэалізацыі Праграмы ўзгодненых дзеянняў у галіне знешняй палітыкі дзяржаў — удзельніц Дагавора аб стварэнні Саюзнай дзяржавы і абноўленай Ваеннай дактрыны Саюзнай дзяржавы, спалучэнне якіх асабліва актуальна ва ўмовах разгорнутай супраць Саюзнай дзяржавы сур'ёзнай інфармацыйнай агрэсіі па тэматыцы Украіны.

— Апошнім часам нашы знешнепалітычныя ведамствы значна пашырылі каардынацыю сваіх крокаў на міжнародных пляцоўках, у тым ліку сумесна з іншымі дружалюбнымі краінамі і аб'яднаннямі, — канстатаваў старшыня профільнай камісіі.

> «Безумоўна, усе крокі Саюзнай дзяржавы ў ваеннай і ваенна-тэхнічнай галінах павінны быць адэкватныя існуючым і прагназаваным знешнім выклікам і пагрозам і адказваць прынцыпу разумнай дастатковасці, — падкрэслівае Сяргей Рачкоў».

Ён адзначыў, што прыярытэтная ўвага ўдзяляецца сумеснаму процідзеянню развязанным супраць абодвух бакоў інфармацыйным кампаніям, аднабаковым абмежавальным мерам, палітызацыі дзейнасці міжнародных арганізацый і навязвання натацэнтрычнай мадэлі бяспекі ў Еўропе.

Сяргей Рачкоў спасылаецца на праграму, згодна з якой асаблівае месца адведзена ўзаемадзеянню па купіраванні пагроз, звязаных з набліжэннем да межаў Саюзнай дзяржавы ваеннай інфраструктуры НАТА. Ён звяртае ўвагу, што дзейнасць знешнепалітычных ведамстваў абедзвюх краін накіравана на пошук шляхоў урэгулявання любых пытанняў палітыка-дыпламатычным шляхам.

У той жа час, адзначае сенатар, з боку заходніх дзяржаў назіраецца выразная негатыўнасць ісці на кампрамісныя рашэнні.

— Акрамя таго, Захад спрабуе ўсяляк дыскрэдытаваць супрацоўніцтва Расіі і Беларусі, умяшацца ва ўнутраную палітыку і дэстабілізаваць абстаноўку ў нашых краінах, — падкрэслівае старшыня профільнай камісіі Савета Рэспублікі. — Таму ў праграме ўзгодненых дзеянняў у галіне знешняй палітыкі дзяржаў — удзельніц Дагавора аб стварэнні Саюзнай дзяржавы ўтрымліваюцца актуальныя ў сучасных умовах мерапрыемствы, якія датычацца каардынацыі ўзаемадзеяння па ваенна-палітычных аспектах, а таксама развіцці ваеннага супрацоўніцтва.

### У адказ на нарошчванне групоўкі

Паводле яго меркавання, сур'ёзным інструментам па забеспячэнні бяспекі і суверэнітэту Саюзнай дзяржавы стане абноўленая Ваенная дактрына Саюзнай дзяржавы, якая была зацверджана летась Вышэйшым Дзяржсаветам.

— Рэалізацыя дактрыны будзе спрыяць паглыбленню тэндэнцыі нарошчвання ўзаемадзеяння Беларусі і Расіі ў сферы актывізацыі супрацоўніцтва прадпрыемстваў абаронна-прамысловага комплексу двух краін, гарантавання ваеннай бяспекі, і перш за ўсё на адзінай граніцы Саюзнай дзяржавы, — упэўнены сенатар.

Ён адзначае, што Ваенная дактрына ў поўнай меры ўлічвае значныя змены ваенна-палітычнага становішча на Усходній Еўропе, якія адбыліся за апошнія гады, і вызначае ваенна-палітычныя і ваенна-эканамічныя асновы арганізацыі і забеспячэння ваеннай бяспекі і сумеснай абароны Саюзнай дзяржавы.

— Эфектыўная рэалізацыя палажэнняў ваеннай дактрыны павінна дасягацца з дапамогай ажыццяўлення скаардынаваных мер па забеспячэнні ваеннай бяспекі ўпаўнаважанымі органамі Саюзнай дзяржавы, органамі дзяржаўнага і ваеннага кіравання Беларусі і Расіі, — перакананы Сяргей Рачкоў.

Ён падкрэслівае: дзякуючы прыняццю дактрынальных дакументаў узгадняюцца падыходы Беларусі і Расіі па найбольш важным напрамку — забеспячэнні ваеннай бяспекі Саюзнай дзяржавы.

— Ваеннае і ваенна-тэхнічнае супрацоўніцтва Расіі і Беларусі накіравана на супрацьдзеянне знешнім ваенным пагрозам, галоўнай крыніцай якіх з'яўляюцца дзеянні ЗША і НАТА ва Усходне-Еўрапейскім рэгіёне, — тлумачыць сенатар і звяртае ўвагу на тое, што ў рамках аперацый ЗША і НАТА «Атлантычная рашучасць» і «Узмоцненая перадавая прысутнасць» створана групоўка паблізу беларускай граніцы, яна складае больш за 10 тысяч чалавек і больш за 300 танкаў. Магчыма размяшчэнне ў Польшчы і Прыбалтыцы амерыканскіх ракет сярэдняй і меншай далёкасці (уключаючы гіпергукавыя).

Нагадвае ён і пра заклікі да размяшчэння войскаў ЗША і НАТА ў Польшчы і Прыбалтыцы на пастаяннай аснове і да перамяшчэння ў Польшчу з Германіі тактычнай ядзернай зброі.

— На падставе барацьбы з міграцыйным крызісам Польшча сцягнула да беларускай граніцы 23 тысячы сілавікоў, Літва засяродзіла каля беларускай граніцы каля чатырох тысяч вайскоўцаў, Латвія — 900 чалавек, — нагадвае Сяргей Рачкоў.

### Рашучасці нам не займаць!

Ён адзначае, што адказам Саюзнай дзяржавы на ваенную пагрозу, звязаную з пашырэннем НАТА, стала рэгіянальная групоўка войскаў Саюзнай дзяржавы, якая была створана ў 1999 годзе.

— Войскі Беларусі і Расіі нясуць сумеснае баявое дзяжурства ўжо больш за 25 гадоў. У сакавіку 2021 года міністры абароны дамовіліся аб стварэнні навучальных цэнтраў у Ніжагародскай і Калінінградскай абласцях і ў Гродзенскай вобласці для сумеснай падрыхтоўкі вайскоўцаў, — тлумачыць сенатар. — Ваенна-паветраныя сілы і войскі супрацьпаветранай абароны з лістапада мінулага года перыядычна вядуць сумеснае патруляванне паветраных граніц Саюзнай дзяржавы ў паветранай прасторы Рэспублікі Беларусь, што з'яўляецца выключна важным, паколькі амерыканская стратэгічная (не кажучы ўжо пра тактычную) авіяцыя даўно лётае ў паветраных прасторах Польшчы, краін Прыбалтыкі, а зараз — і Украіны.

Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы звяртае ўвагу: сумесныя дзеянні рэгіянальнай групоўкі адпрацоўваюцца падчас вучэнняў, найбольш значнымі з якіх з'яўляюцца «Захад» (праводзяцца ў асноўным на тэрыторыі Беларусі) і «Шчыт Саюза» (на тэрыторыі Расіі). Дарэчы, у верасні мінулага года прайшло адно з іх — вучэнне «Захад-2021».

— Актывізацыя ЗША і НАТА каля граніц Саюзнай дзяржавы змушае нашы краіны адпрацоўваць новыя варыянты сумесных дзеянняў для розных сцэнарыяў развіцця аператыўнай абстаноўкі на тэатры магчымых ваенных дзеянняў, — кажа старшыня профільнай камісіі і нагадвае, што з гэтага вынікае дамоўленасць прэзідэнтаў Беларусі і Расіі аб правядзенні маштабнай праверкі сіл рэагавання Саюзнай дзяржавы.

Раптоўная праверка праходзіла ў два этапы. Зараз завяршыўся другі этап (з 10 да 20 лютага на тэрыторыі Беларусі) сумесных аператыўных вучэнняў «Саюзная рашучасць — 2022».

— Задума вучэнняў паказвае, з аднаго боку, іх абарончы характар, з другога — гатоўнасць да дзеянняў у адказ Саюзнай дзяржавы ў выпадку агрэсіі, — акцэнтуе ўвагу Сяргей Рачкоў і адзначае, што з завяршэннем гэтага вучэння пачынаецца падрыхтоўка да маштабнага сумеснага вучэння «Шчыт Саюза — 2023», якое будзе праходзіць на тэрыторыі Расіі.

Што датычыцца далейшых сумесных захадаў Беларусі і Расіі па забеспячэнні абароны Саюзнай дзяржавы, сенатар кажа, што яны будуць абумоўлены развіццём ваенна-палітычнай абстаноўкі ў рэгіёне.

> «Ваеннае і ваенна-тэхнічнае супрацоўніцтва Расіі і Беларусі накіравана на супрацьдзеянне знешнім ваенным пагрозам, галоўнай крыніцай якіх з'яўляюцца дзеянні ЗША і НАТА ва Усходне-Еўрапейскім рэгіёне».

— Безумоўна, усе крокі Саюзнай дзяржавы ў ваеннай і ваенна-тэхнічнай галінах павінны быць адэкватныя існуючым і прагназаваным знешнім выклікам і пагрозам і адказваць прынцыпу разумнай дастатковасці, — падкрэслівае Сяргей Рачкоў.

А забеспячэнне ваеннай бяспекі, паводле яго меркавання, павінна прадугледжваць таксама ажыццяўленне палітыка-дыпламатычных крокаў, накіраваных на зніжэнне напружанасці і памяншэнне ваеннай пагрозы Саюзнай дзяржаве.

— Менавіта на гэта нацэлены перагаворы аб гарантыях бяспекі і пагадненне аб мерах забеспячэння бяспекі Расіі, ЗША і НАТА. Ад поспеху або правалу гэтых перагавораў шмат у чым будзе залежаць бяспека і стабільнасць не толькі Саюзнай дзяржавы, але і рэгіёна і свету ў цэлым, — рэзюмуе Сяргей Рачкоў.

**Вольга АЛЯКСАНДРАВА.**

***P.S. Пакуль вярстаўся нумар***

Як ужо вядома, Расійская Федэрацыя 24 лютага пачала спецыяльную ваенную аперацыю на тэрыторыі Украіны пасля таго, як з украінскага боку была павялічана колькасць абстрэлаў мірнага насельніцтва Данбаса.

У сувязі з гэтым, мы пацікавіліся ў старшыні профільнай камісіі Савета Рэспублікі яго стаўленнем да змены становішча ў рэгіёне.

На думку сенатара, падзеі, якія імкліва развіваюцца на ўкраінскім напрамку, яшчэ больш актуалізуюць задачу па забеспячэнні ваеннай бяспекі Саюзнай дзяржавы.

— Гэтыя падзеі сведчаць аб тым, што пытанне захоўвае сваю актуальнасць не толькі ў дачыненні да Саюзнай дзяржавы, але і ў цэлым Усходне-Еўрапейскага рэгіёна, — патлумачыў Сяргей Рачкоў.

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

**Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»**

**Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ АЛЯКСАНДР МІКАЛАЕВІЧ.**

**Адказны за выпуск: АНУФРЫЕВА В. А.**

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by

(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.
**КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН** 311 17 35;
**e-mail:** info@zviazda.by

**Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1.**

**Тыраж 14.804.** **Нумар падпісаны ў 19.30 24 лютага 2022 года.**

# ПРАЯЎЛЕННЕ ВЕРЫ

**26 лютага ў праваслаўнай традыцыі — Сусветная бацькоўская субота. Яе яшчэ называюць мясапуснай, бо яна бывае перад мясапусным — Сырным — тыднем, які папярэднічае Вялікаму посту. Гэты дзень і стаў нагодай для гутаркі ў рамках новага праекта «Зямное і нябеснае», які ёсць намер прысвяціць развагам пра духоўнае і жыццёвае. Наш першы суразмоўца — іерэй Раман АРЦЁМАЎ, клірык Свята-Духава кафедральнага сабора ў Мінску і выкладчык Мінскай духоўнай акадэміі.**



***— Айцец Раман, навошта Царквой устаноўлены бацькоўскія суботы?***

— Як правіла, бацькоўскія суботы прымеркаваны да пэўных падзей, напрыклад да бітвы на Куліковым полі (Дзімітрыеўская), Вялікай Айчыннай вайны (9 мая) альбо прызначаны, каб звярнуць увагу людзей на неабходнасць малітвы аб спачылых. Бацькоўскімі яны называюцца таму, што ў гэтыя дні мы ўспамінаем усіх сваіх продкаў. Дзеці моляцца за сваіх бацькоў, у тым ліку і пасля іх спачыну. Памінальнымі называюцца мясапусная, другая, трэцяя і чацвёртая суботы Вялікага посту, Троіцкая. Але ўвогуле субота ў царкоўнай літургічнай традыцыі — гэта дзень памінання, калі адбываецца асаблівае богаслужэнне.

***— Чаму важна маліцца аб спачылых?***

— Па-першае, таму што Царква ставіцца да смерці не так, як увесь астатні свет. Для Царквы смерць — гэта момант пераходу ў іншае існаванне. Мы не робім жорсткую розніцу паміж жывымі і мёртвымі. Верым, што маецца сувязь тых, хто жыве на зямлі, і тых, хто знаходзіцца ў рэальнасці з Богам. Гэтай сувяззю з'яўляецца наша малітоўная памяць, якую мы ўзносім да Бога і ў Ім усе злучаемся. Гэта адлюстравана ў нашай літургічнай практыцы: мы верым, што калі прычашчаемся Цела і Крыві Хрыстовых, то злучаемся з Хрыстом, а ў Хрысце — з усімі людзьмі, якія да гэтага прычашчаліся Цела і Крыві Хрыстовых і якія прычашчаюцца разам з намі.

Менавіта таму кажам пра глыбокую, універсальную ідэю яднання і адсутнасць межаў, нават тых, якія можа стварыць смерць. Праваслаўная вера сцірае гэтыя межы. Наша памінанне памерлых — не проста нейкі клопат пра тых, хто сышоў, але, у першую чаргу, праяўленне веры — таго, што мы ставімся да смерці інакш.

Па факце, калі разабрацца, смерць пераможана Госпадам, адпаведна ў кожнага з нас ёсць надзея на вечнае жыццё, на ўваскрашэнне. Таму для нас, як кажа апостал Павел, смерць — набытак. Як так можна казаць пра смерць? Можна, калі яе расцэньваць як адзін з этапаў пераходу да жыцця з Богам. Гэта і ёсць асаблівасць хрысціянскага погляду.

Калі мы молімся пра спачылых, то, па-першае, рэалізоўваем сувязь з тымі, каго побач з намі няма, па-другое, выказваем вобраз любові нашага сэрца, бо любая малітва пра памерлага — гэта цэпльная і любоў у адносінах да гэтага чалавека, сведчанне перад Богам пра тое, што гэты чалавек пражыў не дарэмна, ён пакінуў у сэрцы нас з вамі пэўны след любові і цеплыні, які заахвочвае нас маліцца пра яго. У гэтым і ёсць сэнс нашага памінання спачылых, нашай малітвы пра іх.

***— Чаму ўвогуле людзі паміраюць?***

— Насамрэч гэтае пытанне было б больш правільна задаць Госпаду. Бо да канца, ва ўсіх аспектах зразумець, чаму людзі паміраюць, вельмі складана. У багаслоўі ёсць меркаванне пра тое, што смерць — непазбежная з'ява грэхападзення. Яна прыйшла ў наш свет, калі чалавек здзейсніў грэх — адпаў ад любові Бога. Да грэхападзення ў Эдэмскім садзе смерці не было. Наша багаслоўе кажа пра тое, што смерць — нязменны атрыбут свету, які здзейсніў памылку. Гэтую памылку Госпадзь прыйшоў выправіць. І сваёй смерцю, сваім уваскрэсеннем Ён яе выправіў — даў надзею чалавеку на вечнае жыццё, на магчымасць уваскрэсення. Так механізм прысутнасці смерці ў рэальнасці нашага жыцця тлумачыцца праваслаўным багаслоўем.

***— Ці правільна я разумею: смерць засталася, але змянілася да яе стаўленне?***

— Памянялася сама смерць. Мы верым у тое, што да прышэсця Хрыста ў гэты свет паміж людзьмі і Богам была каласальная прорва — бездань, якая не давала магчымасці людзям, якія памерлі — сышлі ў іншы свет, яе пераадолець, каб быць з Богам. Хрыстос змяніў самі законы смерці. Яна не скасаваная, бо чалавечая недасканаласць усё роўна прысутнічае ў гэтым свеце. Але Бог змяніў умовы смерці: чалавек памрэ, толькі ён уваскрэсне. Чалавек памрэ, але ў яго ёсць магчымасць дасягнуць абагаўлення.

Абагаўленне — крайняя ступень уз'яднання з Богам, калі мы становімся настолькі дасканалымі, што можам адчуць нятварнае святло благадаці Божай унутры нашых сэрцаў. Мы кажам пра ступені святасці. Бог робіць гэта магчымым, бо прыходзіць у гэты свет, становіцца Чалавекам і асвячае прыроду чалавека сваёй прысутнасцю. Калі Ён уваскрасае ў чалавечым абліччы, Ён робіць чалавечую прыроду магчымай для ўваскрэсення.

***— Чаму паміраюць дзеці?***

— Не ведаю. Гэта самы галоўны адказ. Гэтае пытанне таксама мае адрасатам не чалавека, а Бога. Таму асабіста я на такія пытанні не адважваюся адказваць.

У Свяшчэнным Пісанні няма адназначнага адказу: чаму і за што чалавек пакутуе. Адпаведна, мы не можам апеляваць да нейкіх указанняў. Іх няма. Прычына пакут нават у Свяшчэнным Пісанні ў кожным канкрэтным выпадку мае вялізную колькасць падстаў.

***— Інакш кажучы, пакуты могуць выпасці і на долю праведнага чалавека?***

— Хутчэй за ўсё. Паколькі Бог яму больш даверае, больш яго любіць і больш выпрабоўвае. Паглядзіце выдатны фільм, зняты нядаўна, — «Чалавек Божы», пра жыццё Нектарыя Эгінскага, святаніцеля Грэчаскай царквы, таксама і нашага святога. Гэта чалавек каласальнай чысціні, усё жыццё пакутаваў. Памёр ад анкалогіі ў адзіноцтве. Ён за грахі пакутаваў? Наўрад ці. Тады чаму? Вось такі ў яго шлях быў ад Бога дадзены. Бог яму настолькі даверяў, што быў упэўнены, што ён вытрымае ўсе гэтыя пакуты, стане яшчэ больш цэльным, глыбокім, дасягне святасці.

***— Напэўна, гэта яшчэ можна зразумець. Але калі пакутуе дзіця?***

— Калі пакутуюць дзеці, тут увогуле не можа быць ніякіх адказаў. Мы іх не ведаем.

***— Што адбываецца з душой чалавека за парогам гэтага жыцця?***

— У Царквы няма дакладнага адказу на пытанне: што канкрэтна, па днях, гадзінах, адбываецца з душой пасля смерці. Усё, што мы з вамі чулі пра трэці, дзявяты, саракавы дзень, пра тое, куды трапляе душа, што з ёй адбываецца, — усё гэта пункты погляду, якія не з'яўляюцца дагматычнымі. Адзінае, што мы дакладна ведаем: калі душа разлучаецца з целам, яна пераходзіць у існаванне з Богам, і з ёй адбываецца так званы прыватны суд. Госпадзь узаемадзейнічае з гэтай душой, паказвае ёй яе вартасці і недахопы. Але пры гэтым канчатковага прысуду не адбываецца. Канчатковы Суд адбудзецца падчас Другога Прышэсця Хрыста.

Праваслаўны багаслоў Грыгорый Ніскі лічыць, што да Страшнага Суда душа знаходзіцца альбо ў чаканні пакут, альбо ў чаканні вечнага блажэнства. Але ёсць і альтэрнатыўныя меркаванні праваслаўных багасловаў. Напрыклад, ёсць пункт погляду сірыйскіх ісіхастаў-містыкаў пра тое, што Бог настолькі нас любіць, што, калі мы да Яго прыйдзем, Ён не будзе нас караць. Калі мы Яго любілі на працягу нашага жыцця, імкнуліся да блізкасці з Ім, то будзем у Яго ласцы. Калі мы Яго не любілі, беглі ад Яго, то... усё роўна будзем у Яго ласцы, але гэтая ласка будзе для нас невыноснай. Гэта як купацца ў любові чалавека, якога мы не пераносім. Вельмі цікавы вобраз, які быў выказаны ў VII стагоддзі.

Праваслаўе шматграннае, пункатаў погляду пра тое, што адбываецца ТАМ, вельмі шмат.

***— Нашы малітвы пра спачылых неяк палягчаюць іх долю?***

— Ёсць і такі пункт погляду, ён досыць распаўсюджаны, але асабіста мне не вельмі імпануе. Такі падыход мае на ўвазе, што нашаму Богу трэба нешта тлумачыць, што Яго можна пераканаць. Ідэя мае права на існаванне, бо адлюстравана ў пунктах погляду многіх святых.

Але мне бліжэй іншая: пра тое, што праз малітвы мы маем сувязь з тымі людзьмі, якія ад нас сышлі. Пра тое, што мы выказваем любоў у адносінах да іх, і Госпадзь бачыць наш подзвіг веры, подзвіг любові, сведчанне цеплыні, якую пакінуў чалавек у нашым сэрцы. Тады атрымліваецца, што гэта малітва больш патрэбна нам, тым, хто застаўся тут. І гэта так і працуе насамрэч.

Пунктаў погляду шмат, і няправільна казаць, што гэта так і не інакш. Бо тады няма свабоды, а Госпадзь стварыў нас свабоднымі. У праваслаўі вельмі шмат багаслоўскіх кірункаў, якія агульнапрынятыя, але яны адрозніваюцца. Таму ў гэтай сітуацыі кожны павінен вызначыць для сябе тое, што бліжэй да яго вобраза веры.

***— Акрамя малітоўнай сувязі з памерлымі, можа быць яшчэ нейкая іншая? Ці можна з імі размаўляць, напрыклад?***

— У гэтай сітуацыі Царква нас перасцерагае. Чаму вектарам нашай малітвы з'яўляецца Бог? За спачылых мы молімся не спачылым, а Богу. Тады наша сувязь з імі нібы праходзіць праз «вышку», якая падзяляе сігнал. Калі ідзэю Бога прыбраць, то ёсць верагоднасць таго, што мы трапім у гульні нашага розуму.

Як святар, я вельмі часта сутыкаюся з тым, што людзі, якія перажываюць страту, расказваюць, як чуюць шоргат, гукі, але хутчэй за ўсё, гэта работа нашай падсвядомасці. Бо з пункту погляду нашай веры, душа, якая пазбаўлена цела, не можа ствараць гукі, перасоўваць прадметы. Часта расказваюць пра нейкія ўказанні ў снах. Але дзе тут гарантыя, што гэта — не наш розум, які зніжае напружанне нашага перажывання і дае гэтыя вобразы? Мы не ведаем. Таму ў праваслаўнай аскетыцы ёсць вельмі дакладнае папярэджанне ад гульняў розуму.

Калі мы не можам індэнтыфікаваць, то лепш з гэтым не гуляць. Таму не молімся людзям, якія сышлі, а молімся Богу аб іх. Бо інакш вельмі лёгка сябе пераканаць, што яны нам адказваюць, што яны маюць з намі зносіны. І гэта не навіна: у нас процьма ўсякіх медыумаў, якія «выклікаюць продкаў». І гэта надзвычай рэч. Таму ў гэтай сітуацыі Царква, як гэта ні дзіўна, больш абапіраецца на рэальнасць, чым сам чалавек. Яна вяртае чалавека да рэальнасці.

***— Але сувязі з тымі, хто сышоў, вельмі хочацца. І супрацьстаяць гэтаму жаданню складана.***

— А навошта вам успаміны? Эмоцыі падчас успамінаў? Гэта і ёсць сувязь. І гэта сувязь выказваецца ў нашай малітве. Бо малітва ж не бязлікая, яна мае напрамак і адрасата. І ў гэтую сувязь — малітву — мы ўкладаем цеплыню, любоў, успаміны. Надаём гэтай малітве жывую форму. Усё астатняе вельмі часта — гульні розуму.

***— Вы кажаце пра малітву сваімі словамі? Бо, здаецца, менавіта тады мы больш выразна ўяўляем чалавека, пра якога молімся.***

— Усё вельмі індывідуальна. Калі мы кажам пра храмавае памінанне, то там, натуральна, гучыць інстытуцыянальна ўстаноўленая малітва. Калі кажам пра келейнае памінанне — наша ўнутранае, штодзённае, дамашняе або калі прыходзім у храм памаліцца ў адзіноце — то тут варыянтаў шмат. Калі ў чалавека няма вопыту або няма слоў, няма сіл, каб нарадзіць малітву — тады ёсць напісаны тэкст. Ён агульны і можа не заўсёды адлюстроўваць вашы ўнутраныя перажыванні. Адлюстраваць іх можа малітва сваімі словамі — выказванне сваіх перажыванняў перад абліччам Бога. Малітва — гэта размова з Богам.

Тут трэба глядзець па сваім стане, па сітуацыі. Ёсць яшчэ адна форма — чытанне Псалтыра. Псалтыр — гэта старазапаветны малітваслоў. Гэта прыгожыя, паэтычныя малітвы. Трэба зыходзіць з таго, што мы адчуваем і што можам даць Богу.

***— Чытаць Псалтыр можна ў любы час?***

— Так, бо тэрміны 40 дзён, год не для таго, хто сышоў. Для таго, хто застаўся. Бо той, хто сышоў, ужо па-за часам. Ён не лічыць дні, тыдні і гадзіны. Ён у вечнасці, а ў вечнасці часу няма. Ён у рэальнасці Бога, і там усё інакш. Пэўныя даты існуюць для нас — каб сябе дысцыплінаваць і абазначыць нейкія межы. Менавіта таму існуюць Сусветныя бацькоўскія суботы, Радаўніца, памінальныя суботы Вялікага посту, гадавіны — усё гэта для нас. Каб нас дысцыплінаваць, каб нам нагадаць. Бо мы жывём — бяжым, а Царква нас прыпыняе, заклікае падумаць, памаліцца пра тых, каго памятаем і любім.

***— Як часта Царква моліцца за памерлых?***

— Некалькі раз на дзень. Царква з асэнсаваннем смерці як іншага жыцця жыве заўсёды. Можна і так сказаць: для Царквы смерці няма. Гэта ўсё адзін працэс. Проста ён падзелены мяжой пад назвай «смерць».

***— Падчас Другога Прышэсця Хрыста ўваскрэсне менавіта цела?***

— Так. Душа злучыцца з целам.

***— І тут не важна, у якім стане будзе знаходзіцца цела?***

— Не важна. Як кажа Максім Спавядальнік, тут важна тое, што ўсе мы знаходзімся ў Божай свядомасці. Законам і залогам нашага ўваскрэсення з'яўляецца тое, што Бог нас ведае. А калі Бог ведае пра кожнага, значыць, не мае значэння, як цела было разбурана. Святы разважае пра тое, што будзе з тымі, хто патануў у моры, чые целы былі з'едзены жывёламі, згарэлі. І кажа, што не важна, як цела было разбурана — важна тое, што яно існуе ў Божай свядомасці.

Калі чалавек з'яўляецца ў гэты свет, ён ужо рэальны, бо ёсць у розуме Бога. Бог пра яго ведае. Таму што Бог яго прывёў у гэты свет.

Увесь наш чын пахавання пабудаваны на веры ва ўваскрэсенне. І веры ва ўваскрэсенне цела ў тым ліку. Стаўленне да цела ў праваслаўнай традыцыі каласальна паважлівае. У старажытнагрэчаскай філасофіі цела — цямніца душы. У нас — вобраз і падабенства Бога, яго асвяціў Сам Хрыстос. Адсюль і павага да месцаў пахавання. Бо гэта месцы, дзе спачываюць вобразы і падабенствы Бога. Мы іх асвячаем, акрапляем святой вадой. Аддаём даніну павагі. Наша абалонка — цела — гэтак сама важная для нас, як і душа.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

